

ЯК ДОБРА АДПАЧЫЦЬ І НЕ ЗАХВАРЭЦЬ **5**

ІТАЛЬЯНСКІ КРЫЗІС УЗРУШЫЎ ЕЎРОПУ **12**



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

2 ЧЭРВЕНЯ 2018 г. СУБОТА № 104 (28720)

*ЛІЧБА ДНЯ*

**536 кампаній**

*з 28 краін свету сёлета прымуць удзел у выстаўцы «Белагра-2018». Колькасць удзельнікаў узрасла ў параўнанні з мінулым годам. Замежныя прадпрыемствы праяўляюць вялікую цікавасць да выстаўкі. У прыватнасці, на сёння ўжо сфарміраваныя калектыўныя экспазіцыі Чэхіі, Індыі, Пакістана. У гэтым годзе мерапрыемства наведае вялікая дэлегацыя з Чэхіі на чале з міністрам сельскай гаспадаркі. Чакаецца, што на «Белагра-2018» прыедуць губернатары Валагодскай і Сахалінскай абласцей і шэраг міністраў сельскай гаспадаркі рэгіёнаў Расіі.*

# МЯЖА ЯК ВЫЗНАЧЭННЕ ЛЁСУ

## Пачаўся рабочы візіт кіраўніка дзяржавы ў Брэсцкую вобласць

**Учора Аляксандр Лукашэнка наведаў пагранічную заставу «Дзівін» Пінскага пагранічнага атрада ў Кобрынскім раёне, вайскоўцы якой ахоўваюць участак на мяжы з Украінай працягласцю 32 кіламетры. Кіраўніку дзяржавы далажылі аб сітуацыі на дзяржаўнай граніцы, паказалі ўзбраенне, тэхніку і службовы транспарт.**



Фота БелТА.

### НА ЎСХОДНІМ НАПРАМКУ

У пачатку наведвання пагранзаставы беларускі лідар звярнуў увагу на сітуацыю на ўсходнім кірунку. Тут няма падраздзяленняў органаў пагранслужбы, якія пастаянна дыслацыруюцца. Пры паступленні інфармацыі аб парушэнні пагранічнікі прыбываюць на месца, у тым ліку ва ўзаемадзеянні з органамі ўнутраных спраў і тэрытарыяльных падраздзяленняў органаў дзяржбяспекі. З расійскага боку прысутнічаюць штатныя падраздзяленні пагранічнай службы ФСБ Расіі.

Паводле слоў Прэзідэнта, у дзеянні беларускіх пагранічнікаў фармалізму быць не павінна, і калі такім чынам вырашылі кантраляваць гэты ўчастак граніцы, то гэта павінна быць эфектыўным і прыносіць карысць.

СТАР. 2



Мінская школьніца Наталля СЕМЯНІДА ў сталічным мікрараёне Чкалаўскі.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# Канікулы!

## КОРАТКА

- **Узвядзенне моста цераз Прыпяць пачнецца ў другой палове чэрвеня. Усе работы праводзяцца ў адпаведнасці з графікам. Пасля дэмантажу аварыйнага пралётнага збудавання ідзе яго разборка, наступным этапам стане ўзвядзенне часовых збудаванняў для мантажу пралёта з металу.**

- Новая разметка з'явілася каля пешаходных пераходаў паблізу пяці мінскіх школ. Надпісы «Вазьміце дзіця за руку» з'явіліся каля пешаходных пераходаў паблізу пяці ўстаноў адукацыі Маскоўскага раёна сталіцы. У будучыні такія надпісы з'явяцца на падыходах да зебры каля іншых школ і дзіцячых садкоў.



- **У Віцебску ў Дзень горада, 23 чэрвеня, у скверы Маякоўскага адкрыюць манументальна-дэкаратыўную кампазіцыю «Віцебскі велікан». Скульптура з бронзы мясцовага Гулівера разам з цыліндрам будзе вышынёй 3 м 12 см. Правобразам стаў Фёдар Махноў, які лічыцца самым высокім чалавекам у свеце. Тым не менш дакументальна рост мясцовага велікана не зафіксаваны. Фёдар Махноў нарадзіўся 18 чэрвеня 1878 года ў вёсцы Касцюкі Старасельскай воласці Віцебскай губерні. З-за свайго вялізнага росту (285 см) стаў вядомым у Еўропе.**



ISSN 1990 - 763X

■ Спецыяльны рэпартаж

# КРЫЛАТАЯ ГІСТОРЫЯ

## Як сям'я заснавала станцыю кальцавання на Палессі



Сёлета споўнілася 18 гадоў, як Наталля ўпершыню трапіла ў Тураў.

**Дзе гэты будынак, у Тураве ведаюць усе. Менавіта сюды, у дом з сімвалам вялікага зуйка, з'язджаюцца арнітолагі, бёрдвотчары ды і проста аматары птушак, якія хочуць паназіраць за рознымі відамі і дапамагчы прыродзе. Працуе станцыя ў доме, які набыла сям'я Паўла Пінчука, Наталлі Карлёнавай і іх сына Лёні. Месца гасціннае, асабліва тут многа людзей увесну, калі на Тураўскі луг вяртаюцца ўсе пералётныя кулікі. Мы завіталі на станцыю і нават патрымалі ў руках баталёна!**

### Вады тут не баяцца

Пакуль усе астатнія раёны церпяць паводку, на Палессі ад яе атрымліваюць асалоду. Разліў Прыпяці — той яшчэ цуд. Наталля расказвае, што ўпершыню сюды трапіла студэнткай і — закахалася ў гэтыя мясціны. Ва ўніверсітэце ў Гомелі яна вывучала птушак прыгарадных лясоў. І вось яе выкладчык прапанаваў з'ездзіць на Тураўскі луг, паглядзець, як кальцуюць кулікоў. Тут Наталля і пазнаёмілася з Паўлам. 7 мая з той сустрэчы споўнілася 18 гадоў.

СТАР. 7

ЗВЯЗДА *Да чытача з любоўю!*

НЯСУМНАЕ ЛЕТА З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

**Вы гарантуеце сабе і сваім блізкім, афарміўшы падпіску на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе**

*Заставайцеся з намі — будзе цікава!*

# МЯЖА ЯК ВЫЗНАЧЭННЕ ЛЁСУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Нам нельга прыпадабняцца расіянам. Яны самі не разумеюць, чаго хочуць і што яны робяць на беларуска-расійскай граніцы. Хай вызначаюцца. Вызначацца — нам не праблема адказаць, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Мы гатовыя ў любы момант даць адэкватны адказ. Калі яны хочуць закрыць граніцу — калі ласка. Закрыюць — мы ў адказ таксама павінны ўвесці кантроль на граніцы. Гатовыя з імі як з саюзнікамі, як з роднымі людзьмі мець зносіны. Межы — гэта перажытак мінулага, яны карысці мала даюць для зносін людзей, тым больш паміж рускімі і беларусамі».

На думку беларускага лідара, не трэба спяшацца — трэба бачыць, чаго хоча расійскі бок. «Мы ведаем, дзе яны павыводзілі войскі, стварылі камендатуру і іншую інфраструктуру», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы расказаў, што дадзены аспект будзе разглядацца на Вышэйшым дзяржаўным савеце Саюзнай дзяржавы, які адбудзецца ў чэрвені. На думку Прэзідэнта, неабходна дакладна дамовіцца аб адносінах паміж пагранічнікамі. «Мы цяпер у працэсе вызначэння нашых сумесных паводзін на беларуска-расійскай граніцы. І спяшацца нам тут не трэба. Але тое, што адбываецца, мы павінны бачыць», — дадаў ён.

## ЗАХАВАЦЬ АСАБОВЫ СКЛАД

Беларускі лідар таксама даручыў вывучыць магчымасць пераразмеркавання асабовага складу паміж арміяй і пагранічнай службай. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што, магчыма, і не варта імкнуцца занадта скарачаць пагранічныя войскі. «Можа быць, нам дзесьці ў арміі падкараціць на 2-3 тысячы, пакінуўшы пагранічнікам гэтую колькасць. Хай яны будуць на кожнай заставе па 5—10 чалавек. Не лішнія, а каб больш свабодна служыць у нейкім рэзерве», — прапанаваў кіраўнік дзяржавы.

Мэтай, паводле слоў Прэзідэнта, з'яўляецца больш эфектыўная падрыхтоўка ваеннаслужачых. «Усё ж такі тут, на заставе, яны жывуць як дома. Няма дзедаўшчыны, нестатутных адносін», — заўважыў ён.

Прэзідэнт падкрэсліў, што сёння мы не ваюем, а навучаем людзей:

«Гэта вельмі вялікая праца, якую мы павінны правесці па пераразмеркаванні разам з войскам асабовага складу органаў пагранічнай службы. Калі яны гэта не змогуць зрабіць, тады мы не будзем гэтым займацца. Калі змогуць, і гэта будзе для дзяржавы выгадна, і гэта будзе на перспектыву, значыць, мы пойдзем гэтым шляхам. Тут ваеннаслужачых навучаюць лепш, чым у арміі. Сістэма іншая, і іх менш».

## КАДРАВАЕ ПЫТАННЕ

Падчас наведвання «Дзівіна» прысутнічаў Юрый Церцель, які займаў пасаду начальніка Асобнай службы актыўных мерапрыемстваў — яго яшчэ называюць пагранічны спецназ. Аляксандр Лукашэнка ўзгадніў прызначэнне Юрыя Церцеля на пасаду начальніка Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Беларусі.

Галоўнае патрабаванне беларускага лідара да яго — навесці жалезны парадак у дзяржінспекцыі.

## ДА РАЗМОВЫ ПРА АСАБІСТАЕ

Пасля гэтага Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з арганізацыяй побыту пагранічнікаў, а таксама сустрэўся і пагутарыў з вайскоўцамі і іх сем'ямі.

Прэзідэнту задалі пытанне, чаго чакаць у сферы сацыяльных праграм, падтрымкі маладых сем'яў з дзецьмі. Ён адказаў, што сёння ў нас сапраўды шмат падобных праграм і праектаў — і ўсе яны розныя. Дарэчы, у Беларусі існуюць такія льготы для сем'яў з дзецьмі, якіх няма ў многіх дзяржавах свету.

Так, сёння не плануецца скарачаць водпуск па доглядзе дзіцяці да трох гадоў. Па словах кіраўніка дзяржавы, пакуль гэта ўдаецца зрабіць, аднак трэба даваць вялікія льготы, калі нараджаецца трэцяе дзіця, яшчэ большыя — са з'яўленнем чацвёртага, беспрэцэдэнтныя — пятага. Асноўны аб'ём падтрымкі трэба накіроўваць на тое, каб дзяцей у сем'ях станавілася больш, дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Асобна беларускі лідар выказаўся з нагоды ўласнай службы ў пагранічных войсках. Паводле яго слоў, яна назаўжды застанецца важнай часткай яго жыцця. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што калі б не трапіў у пагранічныя войскі, то не стаў бы Прэзідэнтам. «Такіх у маім жыцці было некалькі момантаў, што, калі б я іх на сваім шляху не прайшоў, я не быў бы тым, кім ёсць цяпер», — дадаў ён.

Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на выдатныя ўмовы, якія былі створаны на пагранзаставе «Дзівін». Дарэчы, у комплекс акрамя самой заставы і адміністрацыйнага будынка ўваходзіць і шматкватэрны жылы дом.

Яшчэ адно пытанне датычылася міру — яго каштоўнасці і пагроз яму. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, сёння галоўная пагроза — гэта сутыкненні інтарэсаў буйных дзяржаў, асноўным з якіх ён назваў процiборства ЗША і Кітая, паколькі амерыканцы не хочуць губляць лідзіруючыя пазіцыі і манапалізм. Прэзідэнт таксама канстатаваў, што такіх канфліктаў нямала — Расія і Захад, Расія і ЗША, Кітай і Індыя...

Некаторыя сутыкненні пераходзяць у форму ваенных канфліктаў, як было ў Сірыі і на Данбасе: і там, і там адбыўся канфлікт інтарэсаў вялікіх краін, упэўнены кіраўнік дзяржавы.

Ён адзначыў, што малых і сярэдніх дзяржаў — большасць, таму яны не павінны, як флюгеры, прытрымлівацца ў палітыцы рэчышча буйных дзяржаў. «Мы павінны праводзіць жорсткую палітыку і разам выступаць за свае інтарэсы», — дадаў Прэзідэнт.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## ПАРЛАМЕНТ ІСПАНІІ АДМОВІЎ У ДАВЕРЫ ЎРАДУ МАРЫЯНА РАХОЯ



Кангрэс дэпутатаў (ніжняя палата парламента) Іспаніі адмовіў у даверы ўраду Марыяна Рахоя.

Па выніках праведзенага ў пятніцу галасавання, якое транслявалася на сайце палаты, за вынясенне вотуму недаверу выказаліся 180 парламентарыяў, супраць — 169, адзін устрымаўся.

Ініцыятыва была ўнесена Іспанскай сацыялістычнай рабочай партыяй (ІСРП) і ўключала ў сябе прапанову аб кандыдатуры генеральнага сакратара ІСРП Пэдра Санчэса на пасаду прэм'ера. Паводле канстытуцыі краіны, цяпер урад Рахоя павінен падаць каралю заяву аб адстаўцы, а лідар сацыялістаў разглядаецца як палітык, які атрымаў давер палаты, у сувязі з чым кароль прызначае яго кіраўніком кабінета міністраў.

## ФРАНЦЫЯ ЗАСМУЧАНАЯ ПОШЛІНАМІ ЗША, КАНАДА ПРЫМАЕ МЕРЫ Ў АДКАЗ

Прэзідэнт Францыі Макрон назваў «эканамічным нацыяналізмам» увядзенне Вашынгтонам увазных пошлін на метал. Канадскі прэм'ер Трудо заявіў аб шкодзе, якую нанясе гэтае рашэнне, і анансаваў увядзенне пошлін на амерыканскія тавары.

Эмануэль Макрон, каментуючы ўвядзенне ЗША імпартных пошлін на метал, назваў гэтае рашэнне незаконным і памылковым, паведаміў Reuters. «Эканамічны нацыяналізм вядзе да вайны», — падкрэсліў французскі прэзідэнт. Ён заявіў, што мае намер абмеркаваць гэтае пытанне з Дональдам Трампам.

Прэм'ер-міністр Канады Джасцін Трудо назваў прынятыя ЗША меры «карнымі» і «непрымальнымі», піша Bloomberg. «Гэтыя пошліны нанясуць шкоду прамысловасці і рабочым па абодва бакі канадска-амерыканскай мяжы», — сказаў Трудо, дадаўшы, што Канада працягвае весці перагаворы па гэтым пытанні.

Аднак ужо праз некалькі гадзін на прэс-канферэнцыі прэм'ер-міністр Канады і міністр замежных спраў Хрыстa Фрыланд аб'явілі, што Канада ў адказ на пошліны ЗША на імпарт сталі і алюмінію ўвядзе свае на суму да $16,6 млрд.

## ЖЫХАРЫ МАЛАЙЗІІ ВЫРАШЫЛІ САМІ ВЫПЛАЦІЦЬ ГІГАНЦКІ ДЗЯРЖДОЎГ

У маі 2018 года да ўлады ў Малайзіі ўпершыню за 61 год прыйшла апазіцыя. Да таго часу аб'ём доўгу складаў больш за 60 % ад ВУП краіны — больш як 251 мільярд долараў.

За вырашэнне гэтай праблемы ўзяўся новы міністр фінансаў краіны Лім Гуан Энг, і спосаб яму падказала адна неабыякавая грамадзянка.

Усё пачалося з таго, што жанчына па імені Шазаірна Бакці запусціла збор сродкаў на краўдфандынгавай платформе на карысць урада Малайзіі. Яна папрасіла ўсіх неабыякавых людзей скінуцца на аплату непамернага доўгу. Жанчына паставіла за мэту сабраць 100 тысяч долараў і нават сабрала 3,6 тысячы за некалькі дзён.

На гэтую ініцыятыву звярнуў увагу міністр фінансаў і вывеў яе на новы ўзровень. Цяпер ахвяраванні збіраюць у спецыяльны «Фонд надзеі Малайзіі». Грамадзяне актыўна пачалі рабіць узносы і за першыя 24 гадзіны сабралі больш за 7 мільёнаў рынгітаў — гэта 2,35 мільёна долараў.

Новы прэм'ер-міністр Малайзіі, 92-гадовы Махатхір Махамад (ён ужо займаў гэтую пасаду ў 1981—2003 гадах), лічыць, што важныя не толькі грошы самі па сабе (хоць яны вельмі важныя), але і патрыятычны ўздым, які выклікае акцыя па зборы сродкаў.

■ Парламенцкі дзённік

# АДНЫМІ ЛЕКАМІ НЕ АБЫШЛІСЯ

**Учора Міхаіл Мясніковіч, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, упаўнаважаны па супрацоўніцтве з Індыяй, правёў сустрэчу з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом гэтай краіны Сангітай Бахадур. Галоўнай тэмай размовы стала менавіта гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва.**

Тое, што мы актыўна супрацоўнічаем у сферы фармацэўтыкі, — факт вядомы. Гутарка ідзе ў тым ліку пра цяперашняе стварэнне з удзелам індыйскіх кампаній фармацэўтычных заводаў у Бешанковічах, Скідзелі і Калядзічах, першыя два з якіх ужо амаль гатовыя. Але ёсць яшчэ адзін пункт, на які зрабіў акцэнт Міхаіл Мясніковіч, — пастаўкі калійных угнаенняў на індыйскі рынак. «Мы можам разгледаць пытанні не толькі продажу калійных угнаенняў, але і магчымага ўдзелу індыйскага боку ў вытворчасці складаных угнаенняў», — прапанаваў парламентарый. Спікер паведаміў, што існуючы кантракт на пастаўку беларускіх калійных угнаенняў у Індыю заканчваецца ў найбліжэйшыя месяцы. Зусім хутка, у чэрвені, паводле яго слоў, пачнецца работа над новым — на 2018—2019 гады.

На перагаворах, арганізаваных у Савеце Рэспублікі, прысутнічалі і кіраўнікі двух беларускіх кампаній — гендырэктар «Белмедпрэпаратаў» Павел Кахавец і дырэктар лагістычнай кампаніі «Брэміна груп» Васіль Дземянцей. Апошні днямі заявіў, што адмысловую эканамічную зону «Брэміна-Орша» плануецца стварыць да канца лета. «Падрыхтаваны праект указа аб стварэнні спецыяльнай эканамічнай зоны «Брэміна-Орша», які знаходзіцца на разглядзе ў Саўміне. Зараз ідзе дыскусія па прэферэнцыях, якія будуць нашай эканамічнай зоне дадзены», — растлумачыў Васіль Дземянцей.

Гэта будзе другая спецыяльная эканамічная зона ў Беларусі. Першая была створана ў Кітайска-беларускім індустрыяльным парку «Вялікі камень». Па словах дырэктара «Брэміна груп», упор у эканамічнай зоне будзе зроблены на супрацоўніцтва з Індыяй.

**Вераніка ПУСТАВІТ**

■ Саміт СНД

# СВАБОДА ДЛЯ ПАСЛУГ

**Прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй Кабякоў заклікаў краіны Садружнасці Незалежных Дзяржаў паскорыць падрыхтоўку пагаднення аб зоне свабоднага гандлю паслугамі. Пра гэта ён заявіў на пасяджэнні Савета кіраўнікоў урадаў СНД у вузкім складзе, што адбылося ў Душанбэ.**

«Беларускі бок вітае, што работа ў гэтым напрамку зрушылася з мёртвага пункта, аднак яшчэ нямала трэба будзе зрабіць», — адзначыў Андрэй Кабякоў. Так, прынцыповага вырашэння патрабуе пытанне аб пашырэнні сферы прымянення пагаднення. Неабходна ўрэгуляваць асобныя аспекты ў сувязі з удзелам краін СНД у такіх арганізацыях, як ЕАЭС і СГА. Беларусь ініцыюе распаўсюджванне зоны свабоднага гандлю на галіну электроннай камерцыі. Не менш важная ўніфікацыя правіл і працэдур рэгулявання дзяржаўных закупак, бо на практыцы ёсць праблемы з доступам на рынкі іншых краін.

У рамках Саміту прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй Кабякоў і старшыня ўрада Расіі Дзмітрый Мядзведзеў абмеркавалі пытанні двухбаковага супрацоўніцтва, а таксама графік будучых сустрэч.

**Вераніка ПУСТАВІТ**

■ Знешняя палітыка

# РЫНКІ І ДЫЯЛОГ

**Міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей правёў перагаворы ў Бруселі. Кіраўнік знешнепалітычнага ведамства Беларусі сустрэўся з бельгійскім калегам і з прадстаўнікамі структур Еўрасаюза ў рамках двухбаковага візіту ў адказ па запрашэнні намесніка прэм'ер-міністра — міністра замежных і еўрапейскіх спраў Бельгіі Дзідзье Рэйндэрса.**

Уладзімір Макей растлумачыў журналістам АНТ, што Брусель лічыцца еўрапейскай сталіцай і тут важна сустракацца з прадстаўнікамі асноўных еўрапейскіх структур, якія маюць тут штаб-кватэры. Але на гэты раз асноўныя перагаворы — з бельгійскім калегам. Чакаецца, што сустрэча са спадаром Рэйндэрсам надасць новы імпульс двухбаковым гандлёва-эканамічным адносінам, паслужыць больш шырокаму выхаду для Беларусі на еўрапейскі рынак, а для Бельгіі — на еўразійскі. Тавараабарот з гэтай краінай складае $370 млн, пры гэтым амаль палова — экспарт. Але патэнцыял выкарыстаны не ўвесь.

Напярэдадні беларускі міністр абмеркаваў бягучы стан дыялогу Беларусі з Еўрапейскім саюзам і яго перспектывы з высокім прадстаўніком па замежных справах і палітыцы бяспекі Еўрапейскага саюза, віцэ-прэзідэнтам Еўрапейскай камісіі Федэрыка Магерыні.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

# ЧЫМ ВЁСКА БАГАТАЯ...

## На «Белагра-2018» прадставяць самаробныя трактары і апошнія аграрныя тэхналогіі

**Сельская гаспадарка становіцца адным з драйвераў эканомікі ЕАЭС і краін постсавецкай прасторы. Пра гэта паведаміў начальнік галоўнага ўпраўлення знешнеэканамічнай дзейнасці Мінсельгасхарча Аляксей БАГДАНАЎ падчас прэс-канферэнцыі, прысвечанай арганізацыі выстаўкі «Белагра-2018». Паводле яго слоў, перыяд стагнацыі на рынках сельскай гаспадаркі СНД і ЕАЭС паступова заканчваецца.**

Аляксей Багданаў адзначыў, што сёння ў развіццё сельскай гаспадаркі ўкладваюцца вялікія рэсурсы, а тэхналогіі, якія прапануе наша дзяржава, і дасягненні аграрнай навукі запатрабаваныя на міжнародным рынку.

«Мы ўскладаем вялікія надзеі на выстаўку «Белагра-2018». Чакаем наплыў наведвальнікаў з краін ЕАЭС, СНД. Традыцыйна выстаўка прыносіць добрыя дывідэнды для Беларусі. Мы знойдзем новыя шляхі для нарошчвання аб'ёмаў экспарту сельгаспрадукцыі, беларускіх тэхналогій», — адзначыў кіраўнік упраўлення.

Таксама ён расказаў, што за мінулы год тавары беларускай мяснай і малочнай прадукцыі ў сукупнасці былі экспартаваныя ў 70 краін свету. «Накіраванасць нашай эканомікі на дыверсіфікацыю экспарту працуе і будзе працоўвацца. У першым квартале сёлета мы нарасцілі экспарт тавараў у краіны за выключэннем Расіі на 34 % больш да ўзроўню мінулага года. Мы спадзяёмся, што выстаўка паспрыяе росту аб'ёмаў паставак», — паведаміў Аляксей Багданаў.

Вядучы форум аграрыяў «Белагра-2018» пройдзе ў аграгарадку Шчомыслiца, недалёка ад сталіцы, з 5 па 10 чэрвеня. Чакаецца што сёлета на форум прыедуць 536 кампаній з 28 краін свету (летась іх было 507 з 25 краін).

Як паведаміў **намеснік генеральнага дырэктара кампаніі «Мінскэкспа», дырэктар выстаўкі «Белагра-2018» Аляксандр МАКАЎЧЫК,** на мерапрыемстве будуць прадстаўлены тэхніка, тэхналогіі і абсталяванне для сельскагаспадарчай вытворчасці, фермерскіх і цяплічных гаспадарак, аграхімія, сродкі ахове раслін і глебаў, кармавыя дабаўкі, ветпрэпараты і медыкаменты, рыбацкая вёска. Асобную залу зойме экспазіцыя «Белпрадукт» у якой прымуць удзел 114 вядучых вытворцаў харчовай прадукцыі краіны. Па словах Аляксандра Макаўчыка, таксама сёлета малыя фермерскія гаспадаркі прадставяць міні-тэхніку ўласнай вытворчасці — 17 адзінак самаробных трактароў.

Усе ахвотныя змогуць бясплатна адправіцца на выстаўку — для наведвальнікаў будзе арганізаваны трансфер са станцыі метро Малінаўка ў Мінску да Шчомыслiцы. Адтуль кожныя паўгадзіны будзе адпраўляцца бясплатны аўтобус.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

---

■ Падрабязнасці

# АЭС будуць ахоўваць комплексы «Тор-М2»

Сёння непадалёку ад Астраўца быў урачыста адкрыты ваенны гарадок 1146-га гвардзейскага зенітнага ракетнага палка. Ён будзе прыкрываць Беларускую АЭС з паветра. Станцыя знаходзіцца адсюль у зоне прамой бачнасці. Полк узброены зенітнымі ракетнымі комплексамі «Тор-М2», якія зусім нядаўна паступілі ў армію. Усяго адна такая машына здольная адначасова знішчыць да васьмі цэляў.

— Полк на паўночна-заходнім кірунку выконвае задачы прыкрыцця паветранай прасторы Беларусі, — паведаміў **міністр абароны краіны Андрэй РАЎКОЎ.** — Падчас работы агульнай сістэмы проціпаветранай абароны полк будзе ажыццяўляць фізічнае прыкрыццё атамнай электрастанцыі, якая ўводзіцца ў эксплуатацыю ў наступным годзе. Чаму для ўзбраення выбраны менавіта комплексы «Тор-М2»? Гэты кірунак мы лічым адным з самых важных. І лагічна, што яго абараняе найноўшая зброя.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК**

---

■ Прадпрымальніцтва

# НЕ ІП, А ПРОСТА ЦЫРУЛЬНІК, ТЫНКОЎШЧЫК, ЗБОРШЧЫК...

**Дзейнасць работнікаў цалкам магчымая без рэгістрацыі ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка. Але падаткі трэба плаціць**

**Арганізацыя працы, так сказаць, «дома» спрацілася да двух крокаў. Але іх трэба зрабіць, а не цішком круціцца і наогул не плаціць падаткі. Указ кіраўніка дзяржавы № 337, істотна пашырыў пералік відаў дзейнасці, якія фізічныя асобы маюць права ажыццяўляць без рэгістрацыі ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка.**

Як растлумачылі рэдакцыі ў прэс-службе сталічнай падатковай інспекцыі, гэты пералік відаў дзейнасці мае восем частак. Да іх, у прыватнасці, адносяцца:

— цырульніцкія і касметычныя паслугі, манікюр, педыкюр;

— тынковачныя, малярныя, шкляныя работы, пакрыццё падлогі, абліцоўванне сцен, абклейванне сцен шпалерамі, мураванне (рамонт) печаў і камінаў;

— аказанне паслуг па дызайне інтэр'ераў, графічным дызайне, афармленні (упрыгожванні) аўтамабіляў;

— рамонт гадзіннікаў, абутку;

— рамонт і перацяжка хатняй мэблі з матэрыялаў заказчыка;

— зборка мэблі;

— вытворчасць адзення, галаўных убораў, абутку з матэрыялаў заказчыка;

— распрацоўка вэб-сайтаў, усталяванне (налада) камп'ютараў і праграмнага забеспячэння.



**Дзейнасць у рамках гэтага ўказа ажыццяўляецца фізічнай асобай самастойна выключна для грамадзян, якія набываюць або якія выкарыстоўваюць тавары (работы, паслугі) для асабістых мэт.** Пры гэтым не патрабуецца рэгістрацыя ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка, вядзенне і прадстаўленне справаздачнасці, выкарыстанне касавага апарата.

Здавалася б, усё проста, аднак...

Інспекцыяй МПЗ па горадзе Мінску ў сакавіку была праведзена акцыя «Заплаці падаткі — працуй сумленна», вынікі якой паказалі, што **значная колькасць фізічных асоб нелегальна аказвае цырульніцкія паслугі, паслугі па манікюру, займаецца аздабленнем памяшканняў** (тынковачныя, малярныя, шкляныя работы, абліцоўванне сцен і інш.). Рабілі яны гэта «ў шэрую» і не плацілі падаткаў наогул.

Таму спецыялісты падатковай інспекцыі звяртаюць увагу вось на што. Усім фізічным асобам, якія жадаюць працаваць у рамках Указа № 337, да пачатку ажыццяўлення дзейнасці неабходна выканаць толькі дзве ўмовы. Па-першае, падаць у падатковы орган па месцы рэгістрацыі пісьмовае паведамленне з указаннем віду дзейнасці, месца і перыяду ажыццяўлення. Другі крок і канчатковы — выплаціць адпаведную суму падатку толькі за той месяц (перыяд), калі дзейнасць ажыццяўлялася.

Стаўкі адзінага падатку па горадзе Мінску ўстаноўлены рашэннем Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў ад 30.03.2018 г. № 29 і ў месяц складаюць, напрыклад:

— цырульніцкія і касметычныя паслугі, манікюр, педыкюр — 99 рублёў;

— тынковачныя, малярныя, шкляныя работы, работы па ўладкаванні пакрыццяў падлогі і абліцоўванні сцен, абклейванне сцен шпалерамі, мураванне (рамонт) печаў і камінаў — 117 рублёў.

Больш падрабязную інфармацыю можна атрымаць па сталічных тэлефонах: 189 (стацыянарная сетка), 229 79 79.

**Сяргей КУРКАЧ**

---

■ Культасвета



# Заспявай, птушачка!

## Стартаваў нацыянальны адбор на дзіцячае «Еўрабачанне»

**Белтэлерадыёкампанія абвясціла аб пачатку прыёму заявак на адборачны тур дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне-2019». Нагадаем, сёлета міжнародны творчы форум пройдзе ў Мінску пад дэвізам Light Up! («Запальвай!»).**

Прадставіць нашу краіну ў песенным конкурсе змогуць юныя артысты, якім на дату правядзення шоу — 25 лістапада — будзе не менш за 9 і не больш за 14 гадоў. Да адбору дапускаюцца як беларусы, так і замежнікі — але з умовай, што яны пастаянна жылі ў Беларусі як мінімум 2,5 года. Што да конкурснай песні, то больш чым напалову яна мусіць быць на беларускай або рускай мове (замежнай дапускаецца не больш як 40 % агульнага аб'ёму тэксту) і не быць камерцыйна рэалізаванай або публічна выканаш да 1 мая бягучага года.

Заяўкі з паметкай «На дзіцячы конкурс песні «Еўрабачанне» прымаюцца ў выглядзе каштоўных бандэроляў на адрас 220014, г. Мінск, вул. Макаёнка, 9. Апошні дзень прыёму заявак — 29 чэрвеня, а ўжо да 7 ліпеня журы вызначыць ад 7 да 10 фіналістаў нацыянальнага адбору. Хто ж у іх пераможа, стане вядома падчас гала-канцэрта, які адбудзецца ў верасні, — тэлегледачы і прафесіяналы музычнай сферы разам выберуць прадстаўніка Беларусі на дзіцячым «Еўрабачанні-2018». Дарэчы, наша краіна ўдзельнічае ў дзіцячым конкурсе з моманту яго заснавання ў 2003 годзе і, у адрозненне ад дарослага шоу, мае вельмі добрыя вынікі. У скарбонцы беларусаў — дзве перамогі (2005 і 2007 гады), адно другое і два трэція месцы.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

---

■ Здарэнне

# Скраў машыну, пакуль гаспадар спаў

**У Першамайскі РУУС г. Мінска паступіла заява ад жыхара раёна аб крадзяжы транспартнага сродку. Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку знайшлі зламысніка і ўстанавілі абставіны злачынства.**

Два суседы ў кватэры дома па вуліцы Бяляева распівалі спіртныя напоі. Напярэдадні адзін мужчына прасіў у другога машыну ў часовае карыстанне, аднак атрымаў адмову. Добра падпіўшы, гаспадар аўтамабіля заснуў, а яго таварыш скарыстаўся сітуацыяй, выкраў ключы ад машыны і паехаў забіраць сваю жонку з працы. Але даехаць да месца прызначэння яму перашкодзілі супрацоўнікі ДАІ, якія прыцягнулі мужчыну да адміністрацыйнай адказнасці за кіраванне аўтамабілем у стане алкагольнага ап'янення. А пазней устанавілі і тое, што машына лічыцца скрадзенай, бо да таго часу гаспадар транспартнага сродку ўжо прачнуўся, выявіў прапажу і паведаміў у міліцыю. Злодзей, 36-гадовы непрацуючы жыхар сталіцы, ужо неаднаразова прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за маёмасныя злачынствы і незаконны абарот наркотыкаў. На гэты раз зламысніку можа пагражаць адказнасць у выглядзе абмежавання або пазбаўлення волі да пяці гадоў.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

---

■ Фестывалім

# На дзень у краіну «Аббы», Карлсана і лаканічнага дызайну

## У Мінску стартуюць Дні нацыянальных культур

**У суботу, 2 чэрвеня, на плошчы Свабоды пройдзе Дзень Швецыі — ён распачне шэраг фестываляў, якія захлісньць беларускую сталіцу на працягу ўсяго цёплага сезона. Дзень Швецыі адбудзецца ў межах тыдня гэтай дзяржавы, які быў адзначаны фотавыстаўкай, паказам мод і кінафестывалем.**

Арганізатары абяцаюць разнастайнасць тэматычных зон, дзе кожны зможа знайсці сабе забаву па гусце. Культурна-адукацыйная, дзіцячая, аўтамабільная, індустрыяльная, спартыўная, інфармацыйная пляцоўкі, зона прыгажосці, фудкорт пазнаёміць мінчан і гасцей сталіцы з культурай і вытворчасцю гэтай паўночнай краіны.

Любы ахвотны зможа наведаць майстар-клас па традыцыях святкавання сярэдзіны лета ў Швецыі з гульнямі і песнямі, а таксама размалёўваць драўляныя фігуркі. Можна будзе таксама патрапіць на ўрок шведскай мовы і паспытаць шчасця ў вікторыне.

Характэрна, што на свяце будуць устаноўлены спецыяльныя кантэйнеры для сартавання смецця. А для зніжэння колькасці пластыку можна будзе атрымаць на фудкорце напоі ва ўласныя кубкі. Той, хто возьме ўдзел у конкурсах, зможа выйграць кубачкі шведскага дызайну шматразовага выкарыстання.

Упрыгожаннем свята стане зорка шведскай поп-музыкі Jenny from Ace of Base, якая выступіць з вячэрнім канцэртам на галоўнай сцэне каля Ратушы. На працягу ж усяго дня ў Верхнім горадзе будуць гучаць песні знакамітых шведскіх выканаўцаў — ABBA і Roxette. Свята для мінчан і гасцей сталіцы арганізуе Пасольства Швецыі ў Рэспубліцы Беларусь сумесна з Мінскім гарадскім выканаўчым камітэтам пры падтрымцы шведскіх і беларускіх кампаній.

**Дар'я КАСКО**

**Праграма фестываляў:**

**Чэрвень**
2 чэрвеня — Швецыя;
9 чэрвеня — Расія;
16 чэрвеня — Вялікабрытанія.

**Ліпень**
21 ліпеня — Эстонія;
28 ліпеня — Грэцыя.

**Жнівень**
4 жніўня — Літва;
5 жніўня — Польшча;
11 жніўня — Карэя;
18 жніўня — Украіна;
25 жніўня — Італія;
26 жніўня — Арменія.

**Верасень**
1 верасня — Грузія;
15 верасня — Малдова;
16 верасня — Ізраіль;
22 верасня — Азербайджан.

**ИЗВЕЩЕНИЕ**

**Коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Запад» доводит до сведения заинтересованных лиц о внесении изменений в проектную декларацию о строительстве жилых помещений объекта «Реконструкция застройки территории в районе ул. Михалово, Алибегова.» Жилой дом № 4 по генплану»,** опубликованной в газете «Звязда» № 147 (28511) от 03.08.2017, № 231 (28595) от 30.11.2017

Предполагаемый срок ввода жилого дома в эксплуатацию – 2 июля 2018 года.

УНП 192400611

# НЕ ТУРЫСТЫЧНАЯ ВАНДРОЎКА

## Антарктыда сустрэла беларускіх палярнікаў зусім не ласкава



**«Калектыў 10-й Беларускай антарктычнай экспедыцыі аказаўся без «успышак асобных асоб»: гэта была сапраўдная каманда, якая адпрацавала надзейна, упэўнена і добрасумленна. Мы правялі ўнікальны сезон і зрабілі нават больш, чым планавалі...» — заявіў падчас урачыстага прыёму ў Нацыянальнай акадэміі навук нязменны кіраўнік усіх беларускіх антарктычных экспедыцый пачынаючы з 2007 года Аляксей ГАЙДАШОЎ.**

Існуе шматгадовая традыцыя — урачыста праважаць і сустракаць у Акадэміі навук членаў беларускіх антарктычных экспедыцый. Як трапна заўважыў акадэмік Уладзімір Логінаў, лётчыкам звычайна жадаюць, каб колькасць пасадак у іх раўнялася колькасці ўзлётаў, а для палярнікаў важна, каб колькасць вяртанняў супадала з колькасцю ўрачыстых провадаў. І калі ўсе вярнуліся дадому жывыя і здаровыя, гэта ўжо можна лічыць поспехам.

Галоўнае ва ўмовах ізаляцыі ад Вялікай зямлі — поўная псіхалагічная сумяшчальнасць удзельнікаў экспедыцыі, іх кантактнасць, камунікабельнасць і маральна-валявыя якасці. Каб можна было цалкам давяраць чалавеку, што знаходзіцца побач з табой.

Між іншым, па словах Аляксея Гайдашова, апошні антарктычны сезон выдаўся надзвычай складаны па метэаўмовах. Напрыклад, у лютым неспрыяльныя метэаўмовы былі 21 дзень з 28. І ў сакавіку больш-менш спакойныя дні можна было пералічыць па пальцах.

— Апошнія гады мы востра адчувалі дэфіцыт часу, таму што паралельна з узвядзеннем станцыі нам трэба было яшчэ і праводзіць вялікі комплекс навуковых работ, — кажа кіраўнік экспедыцыі. — Таму, каб пашырыць нашы магчымасці і падоўжыць на месяц тэрміны навуковых назіранняў, было прынята рашэнне накіравацца на Паўднёвы полюс самалётам авангардную групу для правядзення падрыхтоўчых і інжынерна-тэхнічных работ. І хачу адзначыць, што гэта тактыка цалкам сябе апраўдала.



«Экспедыцыя — гэта толькі вяршыня айсберга, — падкрэслівае Аляксей Гайдашоў. — У яе аснове — праца соцень, а можа, і тысяч людзей, непрыкметная і незаўважная пабочнаму воку. Хачу запэўніць, што камандай 10-й экспедыцыі быў зроблены сур'ёзны крок наперад. Так, мы вымушаны сёння адцягваць сваю ўвагу ад правядзення навуковых даследаванняў і накіроўваць намаганні на ўзвядзенне станцыі. Але тое, што мы робім, ідзе толькі на карысць, бо сучасная навука з блакнотам на каленях не робіцца. Для гэтага павінна быць створана сур'ёзная інфраструктура».

У будаўніцтве другога аб'екта Беларускай антарктычнай станцыі пройдзены экватар. Ужо змантаваны 4 секцыі з 8, у тым ліку навуковая лабараторыя фізікі атмасферы, дзве жылыя секцыі і санітарна-гігіенічная. Астатняе будзе зроблена ў найбліжэйшыя два гады. У планах — мантаж другой навуковай лабараторыі, медыцынскага блока, без якога проста немагчымая зімоўка ў Антарктыдзе.

Дарэчы, у складзе 10-й антарктычнай экспедыцыі былі як «дзяды», так і дэбютанты — усяго сем чалавек. Аляксей ЗАХВАТАЎ, інжынер-механік, у экспедыцыі ўдзельнічаў ужо трэці раз, інжынер-радыёметрыст Максім ГАРБАЦЭВІЧ і інжынер-геафізік Павел ШАБЛЫКА — другі раз. Сярэдні ўзрост удзельнікаў — ад 25 да 35 гадоў.

Кіраўнік экспедыцыі разлічвае, што на наступны сезон у Антарктыду адправяцца ўжо 8 чалавек, і сярод іх будзе кухар. «З перспектывай зімоўкі, якая ўжо не за гарамі, мы павінны «абстраляць» новага чалавека, каб ён зразумеў, дзе і ў якіх умовах яму давядзецца працаваць, і, магчыма, унёс прапановы па паляпшэнні свайго працоўнага месца. Добрае здаровае харчаванне — гэта, паверце, падмурак для многіх рэчаў», — патлумачыў ён.

У 2019—2020 гадах Беларусь плануе перайсці да круглагадовых зімовачных мерапрыемстваў у Антарктыдзе. А пакуль што беларускія экспедыцыі праходзяць на ледзяным кантыненце толькі падчас палярнага лета: тэмпература вагаецца ад +3 да -28 градусаў, у той час як у зімовы перыяд яна апускаецца да -56 градусаў. Таму наперадзе ўсіх чакаюць яшчэ больш сур'ёзныя выпрабаванні.

Груз з сабранымі ў Антарктыдзе ўзорамі і навуковым матэрыялам прыбудзе на караблі ў Санкт-Пецярбург толькі 6 чэрвеня, а адтуль яго адправяць у Мінск, у навуковыя лабараторыі. Таму першыя вынікі іх аналізу з'явяцца не раней чым праз два-тры месяцы. Але ў тым, што яны будуць, ніхто не сумняваецца.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Больш фота глядзіце на сайце www.zviazda.by**

■ На ўласным прыкладзе

# «ЛЕПШ ПАКІДАЦЬ АГРЭСІЮ НА ТРЭНІРОЎКАХ»

## Брастаўчанін адкрывае ў раёнах залы адзінаборстваў, каб ратаваць цяжкіх падлеткаў

**Калі б мы сустрэліся з Ігарам РАШЧАНКАМ гадоў 10 таму, напісаць пра яго можна было б хіба ў крымінальнай зводцы. Яго юнацтва прайшло не ў тых кампаніях і не за тымі заняткамі. Пра тое, як складана вырвацца з такога акружэння, Ігар ведае па сабе. Таму, стаўшы на ногі, вырашыў дапамагаць іншым цяжкім падлеткам. Мужчына адкрывае ў маленькіх гарадах залы адзінаборстваў, каб выцягваць хлапцоў з дрэнных кампаній і праз спорт выхоўваць іх.**



Праект Ігара РАШЧАНКІ «Я расту са спортам» атрымаў на фінале конкурса Social Weekend фінансавую падтрымку.

### У планах — Камянец і Маларыта

Ігар родам з маленькага горада Белаазёрска. За плячыма — дзевяць класаў базавай школы, універсітэтаў не заканчваў. «Жыццё ўсяму вучыла», — па-філасофску заўважае ён. Працы мужчына ніколі не баяўся і браўся за ўсё: шчыраваў і на будоўлі, і на пілараме. А потым пазнаёміўся са сферай продажаў. Спачатку ўладкаваўся ў краму, якая гандлявала мабільнымі тэлефонамі, потым стаў гандлёвым прадстаўніком у Брэсце буйной кампаніі па вытворчасці цукерак і жавальных гумак. Адным словам, продажы яму добра ўдаваліся.

Два гады таму Ігар захацеў займацца адзінаборствамі. Пахадзіў па залах Брэста, але не знайшоў тое, што спадабалася б. Тады і падумаў: чаму б не паспрабаваць адкрыць сваю? Тым больш характар баявы. Ноч мужчына не спаў, шукаў у інтэрнэце інфармацыю, пастаўшчыкоў абсталявання. Грошай на свой бізнес было ўсяго тры тысячы долараў. Сказаць, што гэтага недастаткова, не сказаць нічога: адны толькі душавыя кабіны абышліся ў дзве тысячы.

— Дагэтуль не разумею, як змог вырашыць усе праблемы, — прызнаецца Ігар. — Мне пашанцавала, што калега на рабоце падтрымаў маю ініцыятыву і пазычыў грошы. Першы час было вельмі цяжка. Я працягваў працаваць гандлёвым прадстаўніком і адначасова займаўся залай. Паўгода яна кожны месяц цярпела страту 300—400 долараў. Усе грошы туды ўкладаў. Было вельмі крыўдна, калі да цябе на трэніроўку прыходзіла па два чалавекі. Але веды ў рэкламе дапамаглі мне «выплысці».

Пасля Брэста Ігар адкрыў залу адзінаборстваў у Пружанах, на базе мясцовага аквапарка.

— Групу сабралі хутка. Я прыехаў у Пружаны на два дні, і за гэты час у секцыю запісаліся 30 чалавек. Цяпер там займаюцца 50—60 хлапцоў, — расказвае мужчына.

У найбліжэйшых планах — залы ў Камянцы і Маларыце. «У Маларыце раней быў трэнер, але ён з'ехаў працаваць у Маскву, і шмат падлеткаў засталіся без спорту. Таму з 1 верасня збіраемся адкрыць секцыю ў гэтым райцэнтры», — дзеліцца прадпрымальнік.

### Змяніў жыццё дзеля дачкі

Ратаваць цяжкіх падлеткаў Ігар вырашыў, бо сам некалі быў адным з іх. Пра дзяцінства расказвае коратка. Бацька памёр, маці з'ехала, таму з шасці гадоў хлопчык быў сам па сабе. Часам не было чаго есці: каб хоць неяк заглушыць голад, крау бульбу і смажыў на вуголлях.

— Даводзілася ісці на рознае... Сам не заўважыў, як пачаў спажываць наркотыкі. Заўсёды збягаў ад гэтага, але яны былі сам-мі мяне знаходзілі. Восем гадоў не мог пазбавіцца ад залежнасці.

Першы раз за кратамі мужчына аказаўся ў 20 гадоў — за хуліганства. Другі — у 22, далі тэрмін за рабаванне. Ужо тады Ігар зразумеў: трэба мяняцца, пакуль не позна.

— Я не хацеў больш жыць тым жыццём, якое было дагэтуль. Дый ніхто такога не пажадае. Гэта суцэльная тоўстая чорная паласа. Але каб выправіцца, патрэбна дапамога. Толькі правільны калектыў можа выцягнуць з цяжкай сітуацыі. Калі будзеш кантактаваць з ранейшымі прыяцелямі, нічога не атрымаецца... У мяне нікога і не засталося з той кампаніі: хто ў турме, хто памёр. Гэта жудасна.

Мужчына прызнаецца: ніхто не мог зразумець, як у яго атрымалася пачаць новае жыццё. А ён ведае: выратавала дачка. «Гэта маё ўсё. Так, як я палюбіў дачку, нікога не любіў. Увечь сабе баюся, што Эмілія на імгненне ўбачыць тыя моманты, якія перажыў я. Зраблю ўсё, каб такога не здарылася».

З сям'ёй Ігару наогул пашанцавала. Нядаўна ён, каб адкрыць новую залу ў Брэсце (упэўнены, што аналагаў ёй няма ва ўсёй краіне), прадаў кватэру і машыну і пераехаў да цешчы.

— Усе ўспрынялі гэта адэкватна, бо грошы мы ўклалі ў развіццё. Так: або пан, або прапаў, але я ў сабе ўпэўнены. Трэба ж нeяк пашыраццa і зарабляць — мы не збіраліся ўвесь час жыць з дзецьмі ў аднапакаёвай кватэры.

### Іншая кампанія — іншае мысленне

Ісці з адзінаборствамі ў райцэнтры Ігар вырашыў невыпадкова. «У маім дзяцінстве казалі так: чым меншы горад, тым круцейшы нораў», — тлумачыць.

Сваю ідэю ён абмяркоўваў з інспекцыямі па справах непаўналетніх. Кажа, яны ахвотна адгукнуліся.

Няўжо спартыўныя секцыя сапраўды могуць ратаваць праблемнага падлетка? Ігар запэўнівае: змяняеш кампанію — змяняюцца і прыярытэты. Мысленне становіцца іншае. «Але гэта адбываецца не па пстрычцы пальцаў. Патрэбны час. Так, чалавек можа яшчэ пару разоў спатыкнуцца, але калі ён вяртаецца на шлях выпраўлення, гэта ўжо добра».

***— А не атрымаецца так, што падлеткі, навучыўшыся біцца, стануць больш небяспечныя?***

— Калі дзеці прафесійна займаюцца адзінаборствамі, у іх этыку ўваходзіць не прымяняць сваю сілу па-за залай. Мы стараемся гэта кантраляваць. І размаўляем у жорсткай манеры: калі чалавек не гатовы мяняцца, тады трэба развітвацца. Усю сваю агрэсію, стрэс хлопцы пакідаюць на трэніроўках. Энергію падлеткі ўкладае ў дасягненне высокіх спартыўных вынікаў, а не ў супрацьзаконныя ўчынкі.

Брастаўчанін расказвае, што для сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, заняткі ў секцыях будуць бясплатныя. Падлеткам з маламаёмных сем'яў будзе давацца зніжка.

У перспектыве Ігар спадзяецца ахапіць заламі не толькі родную Брэстчыну, але і ўсю краіну. «Хачу стварыць грамадскі рух па прапагандзе здаровага ладу жыцця. Мне здаецца, толькі так можна змагацца з наркотыкамі і іншымі згубнымі звычкамі».

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ** ■



Прымяняць сваю сілу хлопцам дазваляюць толькі ў зале.

# Асцярожна, адпачынак!

## Як не прывезці з-за мяжы небяспечную інфекцыю?

**Краіны Азіяцкага рэгіёна і Карыбскага басейна, Афрыкі і Паўднёвай Амерыкі ў апошнія гады сталі папулярнымі турыстычнымі маршрутамі, аднак вярнуцца адтуль можна не толькі з прыемнымі ўспамінамі, але і экзатычнымі для нас інфекцыйнымі хваробамі. Што важна памятаць падчас падарожжа за мяжу, каб захаваць здароўе, расказала намеснік галоўнага ўрача Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ірына ГЛІНСКАЯ.**

### На што можна захварэць

Падчас наведвання краін з вільготным трапічным кліматам, напрыклад Індыі, Тайланда, Егіпта, В'етнама, ёсць рызыка заражэння вірусным гепатытам А і вострымі кішэчнымі інфекцыямі. А вось небяспека падхапіць малярыю існуе ў 91 замежнай краіне. Неспрыяльная эпідэміялагічная сітуацыя, звязаная з адром, захоўваецца ва Украіне і Еўропе. Найбольшая колькасць выпадкаў гэтай інфекцыі — некалькі тысяч — зарэгістравана ў Румыніі, амаль гэтак жа шмат — у Францыі. Небяспечная сітуацыя і ва Украіне — амаль 16 тысяч выпадкаў. Каля тысячы — у Грэцыі і Італіі. З нядаўняга часу хворых на адзёр выяўляюць у Сербіі, Албаніі, Грузіі. Аб небяспецы заражэння клешчавым энцэфалітам трэба памятаць падчас падарожжа на Далёкі Усход і Урал, прычым гэта актуальна найперш для тых, хто аддае перавагу «дзікаму» адпачынку з палаткамі ў лясных масівах ці сплаву па горных рэках.

**Небяспечная інфекцыя, супраць якой няма прышчэпак, — малярыя. Калі існуе рызыка заражэння, прэпараты супраць гэтай хваробы трэба прымаць працяглы тэрмін — да, падчас і пасля выезду.**

### Пра прышчэпкі паклапаціцеся загадзя

— Небяспечная эпідэмічная сітуацыя ў некаторых краінах свету не азначае, што нельга іх наведваць. Але важна прыняць шэраг прафілактычных мер, каб мінімізаваць рызыку заражэння, — адзначае Ірына Глінская.

Прычым такую падрыхтоўку да адпачынку лепш пачаць загадзя. Па-першае, важна ўдакладніць, якая эпідэміялагічная сітуацыя ў краіне, якую вы збіраецеся наведаць, і высвятліць усе рызыкі. Актуальную інфармацыю можна атрымаць у тураператара, а таксама на сайтах Міністэрства аховы здароўя і ўстаноў санітарна-эпідэміялагічнай службы. Па-другое, неабходна зрабіць прышчэпкі, каб папярэдзіць інфекцыйныя хваробы, у выпадку калі ёсць рызыка іх атрымаць. І ўдакладніць у сваёй паліклініцы ўласны прышчэпкавы анамнез: калі ў вас не хапае пэўных прышчэпак, прадугледжаных нацыянальным календаром, звярнуцца да ўрача і затым рэалізаваць яго рэкамендацыі па імунізацыі.

— Усе вакцыны, якія рэгламентаваны ў межах нацыянальнага календара прафілактычных прышчэпак, маюцца ў дзяржаўных медыцынскіх установах у дастатковай колькасці, — адзначае Ірына Глінская. — Але ёсць важны момант: пра прышчэпкі многія ўспамінаюць за адзін-два дні да выезду. У гэты перыяд іх зрабіць можна, але, на жаль, ахова арганізма сфарміруецца праз тры-чатыры тыдні пасля ўвядзення вакцыны. А калі гаворка ідзе пра клешчавы энцэфаліт, то нават і за большы тэрмін. Таму найбольш аптымальны тэрмін для вакцынацыі — за месяц да выезду.

Для падарожжа ў асобныя краіны Афрыкі і Паўднёвай Амерыкі абавязкова трэба зрабіць прышчэпку супраць жоўтай ліхаманкі — без яе вас спыняць на мяжы. Таксама ёсць пералік краін, дзе яна рэкамендавана. Жоўтая ліхаманка — цяжкае захворванне з ускладненнямі і рызыкай лятальнага канца. Прышчэпка супраць яго робіцца толькі ў сталічнай 19-й цэнтральнай раённай паліклініцы (Першамайскі раён). Пры гэтым выдаецца сертыфікат міжнароднага ўзору. Мінімальны тэрмін, за які паспее сфарміравацца імунітэт, — 10 дзён.

Небяспечная інфекцыя, супраць якой няма прышчэпак, — малярыя. Калі існуе рызыка заражэння, прэпараты супраць гэтай хваробы трэба прымаць працяглы тэрмін — да, падчас і пасля выезду.

Прышчэпкі, якія робяцца ў адпаведнасці з нацыянальным календаром, бясплатныя для дзяцей і дарослых. У прыватнасці, ад адру каляндар прадугледжвае дзве прышчэпкі, якія даюць амаль пажыццёвы імунітэт. Калі нават адной з іх у вас няма, звярніцеся да ўрача ў сваю паліклініку і вам зробяць яе бясплатна. Прышчэпкі, напрыклад, ад клешчавога энцэфаліту, вірусных гепатыту А ці такіх экзатычных хвароб, як жоўтая ліхаманка, робяцца на платнай аснове.

**У апошнія гады неспрыяльная эпідэмічная сітуацыя неаднойчы станавілася праблемай № 1 у свеце. Гэта маштабная эпідэмія ліхаманкі Эбола ў краінах Афрыкі, ускладненне эпідэмічнай сітуацыі, звязанай з ліхаманкай Зіка ў краінах Паўднёваамерыканскага рэгіёна і Паўднёва-Усходняй Азіі, успышка жоўтай ліхаманкі ў Бразіліі, дрэнная эпідэміялагічная становішча па захворваннях, якія выкліканы каранавірусам блізкаўсходняга рэспіраторнага сіндрому ў Саудаўскай Аравіі, Катары, Аб'яднаных Арабскіх Эміратах. Высокай у свеце застаецца і захваральнасць на халеру: яна рэгістравалася ў краінах Паўднёвай і Паўднёва-Усходняй Азіі, у прыватнасці, Індыі, Емене, а таксама ў Афрыцы — Замбіі, Зімбабвэ, Кеніі, на востраве Гаіці і ў Дамініканскай рэспубліцы.**



### Што важна памятаць

Знаходзячыся ў іншай краіне, важна выконваць меры бяспекі. Пазбягаць кантакту з жывёламі: яны з'яўляюцца крыніцай шэрагу інфекцыйных і паразітарных хвароб. Калі ж кантакт адбыўся, месца ўкусу ці абдзірання, аслінення абавязкова трэба прамыць вадой з мылам і неадкладна звярнуцца да ўрача па антырабічную дапамогу.

У шэрагу цёплых краін можна сутыкнуцца з крывасоснымі насякомымі: кляшчамі, камарамі, маскітамі, а таксама грызунамі, якія могуць быць пераносчыкамі паразітарных хвароб. Тут дарэчы будуць рэпеленты і фумігатары для іх адпужвання.

Каб пазбегнуць вострых кішэчных хвароб і вірусная гепатыту А, прыём ежы ажыццяўляйце ў пунктах харчавання, якія рэкамендаваны тураператарам. Тое самае датычыцца і вады. Ужываць трэба або бутэляваную пітную, або напоі прамысловай вытворчасці. Садавіну і агародніну неабходна апаласкваць таксама вадой гарантаванай якасці. Памятайце, што ўжываць мяса, рыбу, морапрадукты можна толькі пасля тэрмічнай апрацоўкі. Калі вы каштуеце экзатычныя ці незнаёмыя прадукты на рынках і ў месцах неарганізаванага гандлю, вы ідзяце на рызыку: атрымаць інфекцыйную хваробу такім чынам вельмі лёгка. Калі набываеце прадукты, важна звяртаць увагу на тэрмін іх прыдатнасці. Не трэба браць з сабой ежу, якая хутка псуецца (вараная каўбаса, малочныя прадукты, кандытарскія вырабы з кароткім тэрмінам захоўвання).

На экскурсіі, рыбалкі, паляванне выязджаць варта ў тыя месцы, якія абазначаны ў турыстычных маршрутах. Памятайце, што купацца лепш у тых вадаёмах, якія рэкамендаваны тураператарам. Падчас плавання пазбягайце заглынання вады.

Калі праз нейкі час пасля вяртання з адпачынку (пры некаторых захворваннях інкубацыйны перыяд цягнецца да месяца) у вас павысілася тэмпература, з'явіліся пачырваненне і боль у горле, сып, вадкі стул, болі ў жываце, млоснасць, трэба звяртацца да ўрача і паведаміць, у якой краіне знаходзіліся. Гэта дапаможа правільна паставіць дыягназ з улікам тых хвароб, якія сустракаюцца ў іншых краінах.

**Алена КРАВЕЦ.**

■ Камунальныя стасункі

# ЭКАНОМІЦЬ ПАДЧАС ВОДПУСКУ? РЭАЛЬНА



**На парозе лета. Настрой цудоўны — адпускны. Чамаданы спакаваныя, і квіткі набытыя. Усё быццам бы зроблена, але... Мы ж забыліся сэканоміць на камунальных плацяжах. Да адпачынку яшчэ дзень, тыдзень, месяц. Тады ўладкоўвайцеся ямчэй і чытайце. Калі вы едзеце ў адпачынак больш чым на 10 дзён запар, то маеце права на пераразлік па пэўных відах паслуг. За што будуць рабіць пераразлік? Калі і што для гэтага трэба падрыхтаваць?**

### ЧАС ДЛЯ РАЗВАРУШВАННЯ — СЕМ ДЗЁН

Для жыхароў сучаснай гарадской кватэры пераразлік будзе не істотны. Але такую паслугу, як абыходжанне з адходамі, можна смела на час адпачынку выкрэсліваць. Не трэба плаціць за халоднае і гарачае водазабеспячэнне, водаадвядзенне, праўда, гэта актуальна толькі пры адсутнасці лічыльніка. З газазабеспячэннем — тая ж карціна, яна «працуе», калі лічыльніка няма. За цеплазабеспячэнне, тэхабслугоўванне ліфта і іншыя паслугі ўсё роўна давядзецца плаціць па поўнай.

Якія дакументы ад вас запатрабуе ЖЭС? Трэба абавязкова напісаць заяву па адпаведным узоры. Спатрэбіцца даведка для пераразліку платы за некаторыя віды камунальных паслуг або іншыя дакументы, якія пацвярджаюць вашу адсутнасць па асноўным месцы жыхарства.

Дакументы трэба падаць не пазней за 7 каляндарных дзён з дня вяртання ў пустую кватэру. Арганізацыя вырабіць пераразлік на падставе вашых дакументаў з улікам тэрмінаў часовай адсутнасці.

### ДАСТАТКОВА ДАВЕДКІ З САДАВОДЧАГА ТАВАРЫСТВА

Дарэчы, пераразлік можна зрабіць не толькі па прычыне ад'езду ў далёкія краі. Партал камунальнай адукаванасці (gkx.by) падрыхтаваў поўны пералік падстаў для пераразліку, а таксама неабходных дакументаў. Пра гэта — падрабязней.

Выезд за мяжу. У гэтым выпадку трэба падаць дакумент, які пацвярджае знаходжанне за мяжой (імянныя праязныя білеты, дакумент, які сведчыць асобу, дакумент з адзнакамі аб перасячэнні мяжы або рэгістрацыі па месцы знаходжання за мяжой і гэтак далей).

Калі вы былі на аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні, то патрэбна даведка з пячаткай з санаторна-курортных і іншых аздараўленчых арганізацый.

Лячэнне ў бальніцы, шпіталі, арганізацыі аховы здароўя, падпарадкаванай дзяржаўнаму органу, у якім прадугледжана ваенная служба, у медыка-санітарнай часткі, дыспансеры і ў радзільным доме. А таксама лячэнне ў дзяржаўнай установе «Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр «Маці і дзіця», хоспісе, медыцынскай навукова-даследчай арганізацыі, медыцынскім навукова-практычным цэнтры, клініцы медыцынскай установы адукацыі, лячэбна-працоўным прафілакторыі, пратэзна-артапедычным аднаўленчым цэнтры. Патрэбна даведка аб знаходжанні (тэрмінах знаходжання) на стацыянарным лячэнні.

Праходжанне ваеннай службы або службы ў рэзерве, ваенных або спецыяльных збораў. Патрэбна даведка аб месцы службы і займанай пасадзе з вайсковай часткі па месцы праходжання ваеннай службы або службы ў рэзерве, ваенных або спецыяльных збораў.

Выезд у сельскія населеныя пункты (у тым ліку на дачныя ўчасткі), на вучобу, у камандзіроўку. Прадстаўляецца даведка з сельскага, пасялковага выканаўчага камітэта, садаводчага кааператыва (таварыства), з навучальнай установы, з месца працы.

### ...І ПА МЕСЦЫ ФАКТЫЧНАГА ПРАЖЫВАННЯ

Калі вы знаходзіцеся па дагаворы найму жылога памяшкання прыватнага жыллёвага фонду грамадзян, паднайму жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду, тады прадстаўляецца даведка для пераразліку платы за некаторыя віды камунальных паслуг, якая выдаецца на падставе зарэгістраванага ва ўстаноўленым парадку дагавора найму жылога памяшкання прыватнага жыллёвага фонду грамадзян, паднайму жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду арганізацыяй, якая ажыццяўляе налічэнне платы за камунальныя паслугі па месцы фактычнага пражывання.

Вы выехалі ў сельскія населеныя пункты для працы ў сельскай гаспадарцы і сацыяльнай сферы сяла па папярэдняй дамоўленасці з сельскагаспадарчымі арганізацыямі і сельскімі Саветамі дэпутатаў. У гэтым выпадку патрэбна даведка з новага месца працы. Такая ж даведка — пры выездзе для працы ў якасці бацькоў-выхавальнікаў у дзіцячых дамах сямейнага тыпу.

Часовае ўтрыманне ў месцах папярэдняга зняволення і пазбаўлення волі. Трэба даведка з месца папярэдняга зняволення або пазбаўлення волі. Праўда, гэта ўжо зусім не адпачынак, але таксама падстава для пераразліку...

**Сяргей КУРКАЧ**

# АБСОЛЮТБАНК

**220023, Республика Беларусь,
г. Минск, пр. Независимости, 95.**

## Финансовая отчетность за год, закончившийся 31 декабря 2017 г.

### ОТЧЕТ О ФИНАНСОВОМ ПОЛОЖЕНИИ

(в тысячах белорусских рублей)

| | Примечания | 31 декабря 2017 года | 31 декабря 2016 года |
|---|---|---|---|
| **Активы** | | | |
| Денежные средства и их эквиваленты | 6 | 49 247 | 38 322 |
| Средства в финансовых организациях | 7 | 667 | 318 |
| Кредиты клиентам | 8 | 51 914 | 33 025 |
| Финансовые активы, имеющиеся в наличии для продажи | 9 | 10 364 | 3 980 |
| Финансовые активы, удерживаемые до погашения | 10 | 7 046 | 15 030 |
| Основные средства и нематериальные активы | 11 | 5 370 | 5 323 |
| Актив по отложенному налогу на прибыль | 26 | 1 247 | 993 |
| Прочие активы | 12 | 4 756 | 6 451 |
| **Итого активы** | | **130 611** | **103 442** |
| **Обязательства** | | | |
| Средства финансовых организаций | 13 | 8 651 | 6 088 |
| Средства клиентов | 14 | 54 825 | 31 977 |
| Выпущенные долговые ценные бумаги | 15 | 15 614 | 14 698 |
| Обязательство по текущему налогу на прибыль | | 1 | 143 |
| Резервы | 28б | 571 | 1 241 |
| Прочие обязательства | 16 | 453 | 445 |
| **Итого обязательства** | | **80 115** | **54 592** |
| **Капитал** | | | |
| Уставный капитал | 17 | 57 005 | 57 005 |
| Накопленный убыток | | (6 509) | (8 155) |
| **Итого капитал** | | **50 496** | **48 850** |
| **Итого обязательства и капитал** | | **130 611** | **103 442** |

### ОТЧЕТ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ

(в тысячах белорусских рублей)

| | Примечания | 2017 год | 2016 год |
|---|---|---|---|
| Процентные доходы | 18 | 8 862 | 13 292 |
| Процентные расходы | 19 | (2 015) | (3 555) |
| **Чистые процентные доходы** | | **6 847** | **9 737** |
| (Создание)/восстановление резерва под обесценение кредитов | 8 | (1 621) | 611 |
| **Чистый процентный доход после резерва под обесценение кредитов** | | **5 226** | **10 348** |
| Комиссионные доходы | 20 | 1 008 | 1 026 |
| Комиссионные расходы | 21 | (738) | (530) |
| **Чистые комиссионные доходы** | | **270** | **496** |
| Чистая прибыль по операциям с иностранной валютой | 22 | 4 509 | 4 637 |
| Чистая прибыль по финансовым инструментам, учитываемым по амортизированной стоимости | | 279 | 36 |
| Чистый убыток, возникающий при первоначальном признании активов | | (32) | (17) |
| Расходы на персонал | 23 | (5 201) | (6 279) |
| Амортизация | 11 | (717) | (484) |
| Прочие доходы | 24 | 520 | 1 128 |
| Прочие расходы | 25 | (3 921) | (5 023) |
| Прочие доходы/(расходы) от обесценения и (создания)/восстановления резервов | 28б | 670 | (743) |
| **Прибыль до налогообложения** | | **1 603** | **4 099** |
| Доходы/(расходы) по налогу на прибыль | 26 | 43 | (903) |
| **Прибыль за отчетный год** | | **1 646** | **3 196** |
| **Прочий совокупный доход за отчетный год** | | | |
| **Итого совокупный доход за отчетный год** | | **1 646** | **3 196** |

### ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИЯХ В КАПИТАЛЕ

(в тысячах белорусских рублей)

| | Примечания | Уставный капитал | Накопленный убыток | Итого капитал |
|---|---|---|---|---|
| **Остаток на 31 декабря 2015 года** | | **55 005** | **(11 351)** | **43 654** |
| Прибыль за отчетный год | | – | 3 196 | 3 196 |
| Прочий совокупный доход за отчетный год | | – | – | – |
| **Итого совокупный доход за отчетный год** | | **–** | **3 196** | **3 196** |
| **Операции с собственниками, отражаемые напрямую в капитале** | | | | |
| Выпуск акций | 17 | 2 000 | – | 2 000 |
| **Остаток на 31 декабря 2016 года** | | **57 005** | **(8 155)** | **48 850** |
| Прибыль за отчетный год | | – | 1 646 | 1 646 |
| Прочий совокупный доход за отчетный год | | – | – | – |
| **Итого совокупный доход за отчетный год** | | **–** | **1 646** | **1 646** |
| **Остаток на 31 декабря 2017 года** | | **57 005** | **(6 509)** | **50 496** |

### ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ

(в тысячах белорусских рублей)

| | Примечания | 2017 год | 2016 год |
|---|---|---|---|
| **Операционная деятельность** | | | |
| Прибыль до налогообложения | | 1 603 | 4 099 |
| **Корректировки к прибыли до налогообложения:** | | | |
| Амортизация основных средств и нематериальных активов | 11 | 717 | 484 |
| Резервы под обесценение кредитов клиентам | 8 | 1 621 | (611) |
| Резерв по отпускам | | (18) | 52 |
| Резерв по обязательствам кредитного характера | 28б | (670) | 743 |
| Резерв по обесценению активов | | 450 | 747 |
| Курсовые разницы | 22 | (496) | (204) |
| Начисленные процентные и комиссионные расходы | | 88 | 391 |
| (Прибыль)/убыток от выбытия основных средств и нематериальных активов | | (18) | (119) |
| Убыток/(прибыль) от выбытия прочих активов | | 13 | (80) |
| Убыток, возникающий при первоначальном признании активов | | 32 | 17 |
| Прочие начисленные доходы и расходы | | 50 | 238 |
| **Увеличение денежных средств и их эквивалентов от операционной деятельности до изменения операционных активов и обязательств** | | **3 372** | **5 757** |
| (Увеличение)/уменьшение операционных активов: | | | |
| Средства в финансовых организациях | | (357) | 36 |
| Кредиты клиентам | | (19 498) | 11 016 |
| Прочие активы | | 1 185 | 2 093 |
| Увеличение/(уменьшение) операционных обязательств: | | | |
| Средства клиентов | | 21 737 | (15 224) |
| Средства финансовых организаций | | 2 838 | (2 293) |
| Прочие обязательства | | 5 | (71) |
| **Чистое увеличение/(уменьшение) денежных средств и их эквивалентов от операционной деятельности до налогообложения** | | **9 282** | **1 314** |
| Налог на прибыль уплаченный | | (353) | (695) |
| **Чистые денежные средства и их эквиваленты от операционной деятельности** | | **8 929** | **619** |
| **Инвестиционная деятельность** | | | |
| Приобретение финансовых активов, удерживаемых до погашения | | (278 000) | (266 178) |
| Поступления от продажи и погашения финансовых активов, удерживаемых до погашения | | 285 986 | 250 718 |
| Приобретение финансовых активов, имеющихся в наличии для продажи | | (45 693) | (3 970) |
| Поступления от продажи и погашения финансовых активов, имеющихся в наличии для продажи | | 39 580 | – |
| Поступления от продажи основных средств | | 51 | 172 |
| Приобретение основных средств и нематериальных активов | | (797) | (2 113) |
| **Чистые денежные средства и их эквиваленты от инвестиционной деятельности** | | **1 127** | **(21 371)** |
| **Финансовая деятельность** | | | |
| Поступления от выпуска долговых ценных бумаг | | 45 789 | 55 659 |
| Выплаты по погашению выпущенных долговых ценных бумаг | | (45 413) | (43 384) |
| Выпуск акций | | – | 2 000 |
| **Чистые денежные средства и их эквиваленты от финансовой деятельности** | | **376** | **14 275** |
| Влияние курсовых разниц на денежные средства и их эквиваленты | | 493 | 3 954 |
| **Чистое увеличение/(уменьшение) денежных средств и их эквивалентов** | | **10 925** | **(2 523)** |
| **Денежные средства и их эквиваленты на начало года** | **6** | **38 322** | **40 845** |
| **Денежные средства и их эквиваленты на конец года** | **6** | **49 247** | **38 322** |

Руководитель В.И. Вашкевич

Главный бухгалтер О.С. Турбина

Дата подписания: 6 апреля 2018 г.

**Бухгалтерская (финансовая) отчетность ЗАО «АБСОЛЮТБАНК» за 2017 год в полном объеме размещена на сайте: https://absolutbank.by/assets/upload/docs/O banke/Financ_Statement/MSFO/Отчетность_МСФО_Абсолютбанк_2017.pdf**

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь № 9 от 24.06.2015. УНП 100331707

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность граждан в Ушачском районе Витебской области

Организатор: Веркудский сельский исполнительный комитет

| Лот № | Местоположение земельного участка, площадь, кадастровый номер | Условия и ограничения, инженерно-геологические условия* | Сумма подлежащих возмещению затрат на формирование и регистрацию участка, руб. | Начальная цена лота, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Городок (уч. 2) Ушачского р-на, Витебской обл., общ. площ. 0,2097 га, кадастровый номер № 224980902101000046 | Земли в водоохранных зонах водных оъектов оз. Паульское | Расходы – 1306,17 Кроме того, плюс затраты на организацию и проведение аукциона | 1000,00 Задаток 10 % 100,00 |
| 2 | д. Городок (уч. 3) Ушачского р-на, Витебской обл., общ. площ. 0,2491 га, кадастровый номер № 224980902101000047 | Земли в водоохранных зонах водных оъектов оз. Паульское | Расходы – 1289,64 Кроме того, плюс затраты на организацию и проведение аукциона | 1000,00 Задаток 10 % 100,00 |

*инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ, здания на участках отсутствуют. Условия развития инфраструктуры: возможность подключения к инженерным сетям.

Целевое назначение участка – для строительства и обслуживания жилого дома, назначение в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества 1 09 02 – земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома).

1. **АУКЦИОН СОСТОИТСЯ 29 июня 2018 года в 10.00 в здании Веркудского сельского исполнительного комитета по адресу: 211493, аг. Веркуды, ул. Школьная, д. 13, Ушачского р-на, Витебской обл., 2-й этаж.** Заявления и пакет документов на участие принимаются по рабочим дням **с 8.00 до 17.00**. Последний день приема заявлений и документов **26 июня 2018 г. до 17.00**.
2. Аукцион проводится в соответствии с Положением, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462.
3. Сумма задатка перечисляется на р/с BY03AKBB36413280200272300000 ф-л № 216 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Полоцк, код AKBBBY21216.

Код платежа – 04901, получатель – Веркудский сельский исполнительный комитет. УНП 300007073.

Контактные номера тел.: 802158 55424, 802158 55427, факс 802158 55423.

## МОМО СВЕДЕНИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «ЕВРОПЕЙСКИЕ КАНИКУЛЫ С МОМО»

Организатор рекламной игры: Общество с ограниченной ответственностью «Мятный знак». УНП 192325716, 220030, Республика Беларусь, г.Минск, ул. Октябрьская, 19Б, оф. 6, этаж 3.

Наименование рекламной игры: «Европейские каникулы с МОМО».

Территория проведения рекламной игры – установленные правилами проведения рекламной игры магазины и объекты общественного питания, расположенные на территории ТЦ «МОМО» г. Минск, пр-т Партизанский, 150А.

Срок начала и окончания рекламной игры: игра проводится с 15 марта 2018 года по 1 июля 2018 года.

Сведения о государственной регистрации рекламной игры: игра зарегистрирована в Министерстве антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь (свидетельство о государственной регистрации № 3222 от 6 марта 2018 года).

Сведения о количестве участников рекламной игры: в игре приняли участие 1 941 (одна тысяча девятьсот сорок один) человек.

Сведения о розыгрыше призового фонда: призовой фонд (1 приз), общий размер которого составляет 3 438 (три тысячи четыреста тридцать восемь) белорусских рублей 82 копейки разыгран полностью.

**Победитель розыгрыша:**

Приз – Туристическое путешествие на 4 человек по маршруту: Минск – Берлин – Амстердам – Брюссель – Париж – Реймс – Люксембург – Трир* – Минск согласно графику на сайте ТКООО «Турлюкс» 2018 (www.tourlux.com) стоимостью 3 006,20 бел. руб. + денежная сумма в размере 432,62 бел. руб.

Шелег-Малиновская Ольга Леонидовна, г. Минск

Поздравляем победителя!

Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры: 8 (033) 335-51-10

## РУП «Торговый дом «Восточный» извещает о проведении 04.07.2018 открытого аукциона по продаже недвижимого имущества

**Лот № 1.** Незавершенное строительство дома с мансардным этажом (садовый домик), размер 6*8 м, расположенное по адресу: Гродненская область, Гродненский район, Обуховский с/с, СТ «Мигово» 82, назначение – садовый, дачный домик (дача) и земельный участок № 82 с кадастровым номером 422086000003000008 площадью 0,0489 га, целевое назначение – садоводство в садоводческом товариществе. **Начальная цена продажи – 36 630,00 рубля, задаток – 3 663,00 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 2.** Земельный участок № 83 с кадастровым номером 422086000003000121 площадью 0,0488 га, целевое назначение – земельный участок для коллективного садоводства, расположенный по адресу: Гродненская область, Гродненский район, Обуховский с/с, СТ «Мигово» 82. **Начальная цена продажи – 1 350,00 рублей, задаток – 135,00 рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 3.** Капитальное строение с инвентарным номером 330/С-4566, общей площадью – 59,7 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская область, г. Мозырь, ул. Портовая, 23; назначение – здание проходной «Южная», 1988 года постройки. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 341500000010000632. **Начальная цена продажи – 14 472,00 рубля, задаток – 1 447,20 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 4.** Капитальное строение с инвентарным номером 330/С-14042, двухэтажный силикатноблочный садовый домик (дача), общей площадью – 111,5 кв. м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 323581800002000068 площадью 0,0588 га по адресу: Гомельская область, Мозырский район, Криничный с/с, СТ «Парус-1», 293. **Начальная цена продажи – 22 230,00 рубля, задаток – 2 233,00 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 5.** Капитальное строение с инвентарным номером 640/С-27563, общей площадью – 97,1 кв. м, расположенное по адресу: г. Слуцк, ул. Ленина, 213А; назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – здание магазина-кулинарии № 1, 1986 года постройки. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 6246500100001006159. **Начальная цена продажи – 60 048,00 рубля, задаток – 6 004,80 рубля. Шаг аукциона – 5%.**

**Лот № 6.** Капитальное строение с инвентарным номером 100/С- 59054, общей площадью 141,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская область, Брестский район, д. Кавердяки, ул. Трудовая, 67Б/3, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – мойка. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 121283004101000402. **Начальная цена продажи – 22 770,00 рубля, задаток – 2 277,00 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 7.** Капитальное строение с инвентарным номером 451/С-5179, площадью 97,8 кв. м, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – котельная, 1970 года постройки. Капитальное строение с инвентарным номером 451/С-9651, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – водопроводный ввод в здание котельной газовой, площадь – 3,0 кв. м. Капитальное строение с инвентарным номером 451/С-9650, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть от здания котельной газовой, площадь – 23,0 кв. м. Капитальное строение с инвентарным номером 451/С-9649, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационный отстойник, площадь – 9,0 кв. м. Капитальное строение с инвентарным номером 451/С-9648, назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, наименование – асфальтобетонное покрытие, площадь – 340,0 кв. м. Адрес: Гродненская область, г. Дятлово, ул. Советская, 102Б. Расположены на земельном участке с кадастровым номером 422350100002000576 площадью 0,0482 га. **Начальная цена продажи – 29 880,00 рубля, задаток – 2 988,00 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 8.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708145686, общей площадью 1244,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Радиальная, 11А-3, назначение – производственное помещение, наименование – производственное помещение. **Начальная цена продажи – 595 080,00 рубля, задаток – 59 508,00 рубля. Шаг аукциона – 5%.**

**Лот № 9.** Изолированное помещение с инвентарным номером 252/D-37560, общей площадью 2090,3 кв. м, расположенное по адресу: Витебская область, г. Новополоцк, ул. Молодежная, 103-97, назначение – торговое помещение, наименование – магазин «Детский мир». Капитальное строение с инвентарным номером 252/С-16204, назначение – сооружение специализированное связи, наименование – линия электропередачи, протяженность – 97,2 м. Расположены на земельном участке с кадастровым номером 241800000004000013. **Начальная цена продажи – 1 957 132,80 рубля, задаток – 195 713,28 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 10.** Изолированное помещение с инвентарным номером 252/D-88946, общей площадью 253,6 кв. м, расположенное по адресу: Витебская область, г. Новополоцк, ул. Молодежная, 12-164, назначение – торговое помещение. наименование – встроенно-пристроенное в жилой дом помещение кафе «Пачастунак» 164. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 241800000007000195. **Начальная цена продажи – 254 718,00 рубля, задаток – 25 471,80 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 11.** Капитальное строение с инвентарным номером 122/С-14367, общей площадью 60,0 кв. м, расположенное по адресу: Брестская область, Ивацевичский район, Стайковский с/с, д. Нехачево, ул. Брестская, 6, назначение – здание из блоков, облицованных кирпичом, одноквартирного жилого дома, наименование – жилой дом № 6, 2009 года постройки. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 123488002601000132. **Начальная цена продажи – 16 200,00 рубля, задаток – 1 620,00 рубля. Шаг аукциона – 5 %**

УСЛОВИЯ

1. Победитель аукциона либо в случае, если заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку не позднее 3 рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
2. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством РБ для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляется в соответствии с действующим законодательством РБ

**Аукцион состоится 04.07.2018 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 27, актовый зал**

Задаток перечисляется на р/с BY81POIS30120021178401933001 ОПЕРУ ОАО «Паритетбанк» 220002 г. Минск, пр-т Независимости, 77, ОКПО 37411910, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), Лот №___, проводимом 4 июля 2018.

Заявление на участие и необходимые документы принимаются в г. Минске, ул. Уручская, 14а, Управление по реализации недвижимости в рабочие дни: пн.–чт. – с 08.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30, пт. – с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 16.15. Окончание приема заявлений 27.06.2018 в 14.00.

**Лот может быть снят с аукциона Организатором по письменном указанию Департамента в любое время до объявления его проданным.**

**Контакты организатора аукциона: +375 17 351 00 01, +375 44 763 62 63, +375 29 551 06 05, +375 29 660 43 51**

# КРЫЛАТАЯ ГІСТОРЫЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Павел тады працаваў у Інстытуце заалогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Яны з калегамі назіралі за міграцыяй, а калі ў 1999-м стартаваў нямецкі праект, прысвечаны кулікам на ўнутраных пералётных шляхах, далі пасткі для адлову — і такім чынам у Тураве пачалося кальцаванне. Тады надзявалі кольцы птушкам на дачы бацькоў сябра. Дом знаходзіцца на той жа вуліцы, што і цяперашняя станцыя. І, такім чынам, прыязджалі працаваць на працягу 4-5 гадоў. Самі жылі на кватэры ў горадзе, хадзіць даводзілася далёка, асабліва гэта адчувалася пасля начных адловаў, таму марылі пра свой дом, вядома ж, бліжэй да Тураўскага лугу.

А ў 2005-м сям'я пачала арандаваць адзін з дамоў з надзеяй потым яго купіць. І сёлета Павел з Наталляй адзначаюць дзесяць гадоў з таго моманту, як у іх з'явіўся ўласны куток у Тураве, а ў беларускай арніталогіі — станцыя кальцавання на Палессі. За гэты час з домам пазнаёміліся многія арнітолагі і валанцёры. Як гаворыць гаспадыня, усе знаёмыя і тыя, хто прыязджае ў Тураў са сваімі экспедыцыямі, могуць спыніцца і пераначаваць у іх.

Калі Наталля скончыла ўніверсітэт, адразу паступіла ў аспірантуру Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Праз чатыры гады абараніла дысертацыю па баталёне. Гэта, як яна прызнаецца, яе любімы кулік, пра што ўжо ўсе і ведаюць. Калі мы завіталі на станцыю, Наталля кальцавала менавіта баталёнаў. Сам працэс выглядае цікава. Птушку вымяраюць літаральна ад дзюбы да лап. Глядзяць нават, наколькі яна тлустая па шкале ад 1 да 4. А яшчэ бяруць кроў для аналізаў. Насамрэч спярша здавалася, што для птушкі гэта дзікі стрэс і дыскамфорт. Але, калі мне даручылі выпусціць баталёна на волю, ён з маіх рук не зляцеў, не збег, а проста саскочыў і пайшоў пехам у бок Прыпяці, быццам кожны дзень сюды ў госці завітвае. Таму, мне падаецца, яны даволі стойка і спакойна перажываюць усе аперацыі, аднак усё ж такі арнітолагі імкнуцца лішні раз іх не чапаць і кальцаваць адразу пасля адловаў, каб птушкі не нудзіліся ў мяшках. Потым аспірантка Наталлі Яўгенія — яна ў Тураве збірае матэрыял для сваёй дысертацыі па мясцовых відах, якія гняздуюцца, — расказала, што ў яе ёсць фішка: апладзіраваць птушцы ва ўслед, калі яна злятае з рук. Выглядае як невялічкі абрад, але робіцца менавіта для таго, каб птушка ляцела, а не садзілася непадалёку, бо тыя ж мясцовыя каты могуць успомніць, што яны драпежнікі, і напасці.


Лёня з першых гадоў дапамагае бацькам на станцыі.

Цяпер Наталля працуе вядучым навуковым супрацоўнікам лабараторыі арніталогіі Навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па біярэсурсах. Тут жа старшым навуковым супрацоўнікам працаваў і Павел да гэтай вясны. Цяпер ён застаўся на пасадзе дырэктара Беларускага цэнтра кальцавання птушак. Атрымліваецца, увесь час разам: і на рабоце, і дома. Побач заўжды і птушкі. Дарэчы, дома сям'я ніякіх дэкаратыўных птушак не трымае, але адзін час завялі невялічкую гаспадарку — дзвюх перапёлак — і збіралі яйкі.

### Паход па марадунку

Лёня сёлета заканчвае другі клас. Расказаў, што хоча быць рыбаловам, таму з вудаю шпацыруе разам з намі па горадзе бліжэй да ракі. Дарэчы, кожны свой дзень нараджэння ў жніўні хлопчык святкуе менавіта ў Тураве. Сам ён з цікавасцю шукае гнёзды з яйкамі, выпускае птушак, ездзіць правяраць пасткі з дарослымі. Паколькі ходзіць у сталічную школу, прыязджаць на Палессе разам з бацькамі, на жаль, атрымліваецца не так часта, як раней.

А мы ідзём шукаць разам з Лёнем, Наталляй, Аняй (магістранткай лабараторыі арніталогіі) і Сержыа (іх знаёмым з Францыі) куліка-марадунку. Гэта птушка — своеасаблівы сімвал Тураўшчыны. На галоўнай плошчы ёй нават ёсць помнік. За дзве гадзіны мы ўбачылі некалькі розных кулікоў Тураўскага лугу, і, вось, перамога: марадунка вылецела на бераг насупраць нас. Добра разгледзелі яе выгнутую дзюбку, рабую шэрую спінку... Высветлілася, што Сержыа ведае сям'ю Паўла і Наталлі ўжо дзесяць гадоў. Ён другі раз прыязджае з Францыі ў Тураў. Першы быў у 2008-м, і вось праз столькі часу вырашыў абнавіць свае ўражанні ад беларускага Палесся. Сержыа гаворыць, што ў яго на радзіме назіранне за птушкамі вельмі папулярнае. Там гэтым займаюцца дзясяткі тысяч людзей, таму і вялікая ўвага ўдзяляецца навакольнаму асяроддзю. Разам з намі марадунку ўбачыла і група бёрдвотчараў з Германіі. Яны мэтанакіравана прыехалі ў Тураў папоўніць свае спісы птушак. Некаторыя з іх, дарэчы, аказаліся знаёмыя з Наталляй. Яна, як і Павел, ладзіць прагулкі-экскурсіі і расказвае пра птушак Тураўшчыны аматарам з розных краін.

Цікавяцца працай у заказніку і калегі з універсітэта ў Гданьску. З імі ў гаспадароў станцыі кальцавання вельмі цесныя кантакты. Нават дзве дысертацыі польскія вучоныя рыхтавалі на Тураўскім лузе: пра куліка-марадунку і пра птушанят кнігаўкі. У маі на іх станцыю завіталі і калегі з Эстоніі, і фатограф з Германіі, які хацеў паказаць разліў Прыпяці. Плюс усе сябры і беларускія бёрдвотчары таксама прыязджаюць на гэтыя дні, каб дапамагчы на станцыі і заадно дадаць новыя віды ў свой спіс. Так што сям'я амаль заўсёды з гасцямі.

### Кулік да Якуціі давядзе

Дарэчы, былі выпадкі, калі мясцовыя дзеці пасля таго, як завіталі да Наталлі і Паўла на станцыю, забаранялі сваім бацькам паляваць. І дарослыя прыходзілі скардзіцца. Дзеці ўжо падраслі і, будзем спадзявацца, захавалі трапяткое стаўленне да прыроды.


Птушак вымяраюць літаральна ад дзюбы да лап.

Сёння дзень на станцыі праходзіць так: з раніцы правяраюць пасткі. Для птушкі гэта невялічкі лабірынт. Яна туды заходзіць і, нягледзячы на тое, што дзверы не зачыняюцца, застаецца ўнутры. Днём арнітолагі плаваюць кожныя 2—3 гадзіны на праверку. Калі няма ветру, яшчэ ездзяць правяраць гнёзды. Іх пазначаюць палачкамі. Мы таксама ўбачылі адно такое, калі ездзілі з Паўлам правяраць пасткі. На ўсё гэта ёсць байдаркі і лодка. Увечары, калі хапае людзей, ставяць сеткі. Падчас начных адловаў робяць дзве праверкі. У сезон хвіліны няма вольнай. Бываюць дні, калі можна за суткі каля 100 птушак акальцаваць. Часам і за ноч столькі трапляюць у сеткі. Па выніках красавіка і паловы мая на станцыі акальцавалі 660 птушак. Больш за ўсё баталёнаў і кулікоў-цякункоў. Найбольш рэдкія — малы кіркун, стучок, бакас, дубальт, кулік-паручайнік.

Кальцуюць Павел і Наталля не толькі ў Тураве. Упершыню, калі я з імі пазнаёмілася мінулым летам, яны вярталіся з Дняпроўска-Брагінскага вадасховішча. Ездзілі туды зноў жа па кулікоў, бо пры нізкай вадзе ў Прыпяці птушкі пераляцелі заходней. Падчас зімоўкі ў Мінску Павел праводзіў навукова-папулярную лекцыю па тых жа куліках. Напрыклад, сярод цікавостак — той факт, што наш баталён залятае за 9000 кіламетраў у Якуцію. Многія баталёны, дубальты і кулікі-перавозчыкі зімуюць у Афрыцы. З Еўропы ў Беларусь спыняюцца ўвесну кнігаўкі, бакасы і зноў жа баталёны. Далей яны рухаюцца ў Скандынавію і Расію.


Пасткі ўдзень правяраюцца кожныя 2—3 гадзіны.

Шчыра кажучы, не ведаю, што рабіць у Тураве пасля дзвюх гадзін на агляд мясцовых славутасцяў. Адзінае, што вабіць сюды яшчэ і яшчэ аматараў дзікай прыроды — птушкі і Прыпяць, якія кожны год увесну раскрываюцца па-асабліваму. Мабыць, у Наталлі і Паўла адно з найбольш прыгожых працоўных месцаў у нашай краіне.

**Надзея АНІСОВІЧ.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА і Арцёма ХАЛАНДАЧА.**

■ Будзь у курсе!

Аналагічнае рашэнне рыхтуецца на Брэстчыне

## У Ваўкавыскім раёне нельга ў лес

**Забарона на наведванне лясоў уведзена на тэрыторыі Ваўкавыскага лягсаса ў сувязі з усталяваннем 4-га класа пажарнай небяспекі.**

У Міністэрстве лясной гаспадаркі нагадалі, што сёлета забарону на наведванне лясоў ужо ўводзілі лягсасы Віцебскай і Гомельскай абласцей. На цяперашні момант усё яшчэ застаюцца закрытымі для наведвання лясы Гомельскай вобласці. У Віцебскай вобласці пасля выпадзення ападкаў абмежавальныя меры былі зняты.

Складаная абстаноўка назіраецца і на тэрыторыі Брэсцкай вобласці. Чакаецца, што рашэнне аб увядзенні забароны на наведванне лясоў у гэтым рэгіёне будзе прынята ў найбліжэйшы час.

З пачатку пажаранебяспечнага сезона ў лясным фондзе Беларусі адбылося больш як 200 пажараў. Шматгадовы аналіз прычын паказвае, што больш за 50 працэнтаў з іх узнікае па віне людзей з-за парушэння правілаў пажарнай бяспекі ў лясах, 33 працэнты — па неўстаноўленых прычынах, 16 працэнтаў — ад сельгаспалаў, 1 працэнт — па віне лесанарыхтоўшчыкаў і іншых арганізацый.

У пажаранебяспечны перыяд спецыялісты дзяржаўнай лясной аховы (больш за 13 тысяч чалавек) перайшлі на ўзмоцнены рэжым работы. На патруляванні і ліквідацыі ачагоў узгарання задзейнічана 360 адзінак тэхнікі. У асобных выпадках на дапамогу прыцягваюцца спецыялісты МНС.

Міністэрства лясной гаспадаркі заклікае грамадзян выконваць правілы паводзін у лесе, а ў выпадку выяўлення ачагоў узгарання неадкладна паведамляць пра гэта работнікам лесагаспадарчых устаноў або аддзелаў па надзвычайных сітуацыях.

З картай забарон і абмежаванняў на наведванне лясоў у раёнах Беларусі можна азнаёміцца на сайце Міністэрства лясной гаспадаркі ■

■ Не сезон

## У СОМА ПАЧАЎСЯ НЕРАСТ

**У чатырох абласцях краіны — Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай — з 31 мая ўстанаўліваецца забарона на вылаў сома ў сувязі з яго нерастам. Яна будзе дзейнічаць да 1 ліпеня. У рыбалоўных угоддзях Брэсцкай і Гомельскай абласцей аналагічная забарона пачала дзейнічаць з 19 мая і будзе ў сіле да 20 чэрвеня.**

Сом нерастуе пазней за іншых рыб пры прагрэве вады да 18 градусаў, нагадалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Забарона на яго вылаў падчас нерасту з'яўляецца адной з мер аховы гэтага некалі чырванакніжнага віду.

Сом спажывае хворую і загінулую рыбу, з'яўляючыся тым самым біямеліяратарам вадаёмаў, які стварае спрыяльныя ўмовы для развіцця здаровай іхтыяфаўны.

Незаконная здабыча адной асобіны сома падчас забароны абыдзецца парушальнікам у 12 базавых велічынь (294 рублі). Апроч таго, на іх будзе накладзены адміністрацыйны штраф — да 50 базавых велічынь. А ў выпадку, калі шкода ад нелегальнай рыбалкі складзе 100 і больш базавых велічынь, можа быць заведзена крымінальная справа.

**Сяргей РАСОЛЬКА** ■

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 19 (415)

# КРОКІ З ЛЮБІЧАМ

## Нацюрморт мастака папоўніў калекцыю Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі

Пасольства Беларусі ў Швейцарскай канфедэрацыі працягвае ўзбагачаць айчынныя музеі. Днямі краіна атрымала ў падарунак «Нацюрморт са збанам» Восіпа Любіча.

Ужо на пачатку года наша краіна атрымала ў дар ад Ганаровага консула Рэспублікі Беларусь у Цюрыху Атанасіяса Акратоса «Маленькі букет кветак» Восіпа Любіча. Гэта ўжо другая карціна творцы, які адносіцца да плеяды беларускіх мастакоў Парыжскай школы, што таксама прыйшла са Швейцарыі. Яна пашырае ўяўленне не толькі пра творчасць Любіча, але і наогул пра той перыяд (пачатак XX стагоддзя), разумець які нам да нядаўняга часу даводзілася тэарэтычна ці па каталогах і альбомах. Пры тым, што мастакі — выхадцы з Беларусі ў той час актыўна ўдзельнічалі ў мастацкім жыцці Еўропы, і сярод іх былі не толькі Марк Шагал і Хаім Суцін, — значна больш імёнаў, значна больш асоб... Іх творы пакрысе вяртаюцца ў Беларусь дзякуючы рупліўцам-збіральнікам мастацкай спадчыны, якая мае дачыненне да нас, і выстаўляюцца для паказу, каб кожны мог убачыць арыгінал. Выбух цікавасці да іх адбыўся падчас прадстаўлення праекта «Мастакі Парыжскай школы з Беларусі» ў 2012 годзе, і музей тады ж атрымаў афорт Восіпа Любіча ў падарунак ад яго дачкі Дзіны, што жыве ў Парыжы.



Перадача ў дар яшчэ аднаго твора Восіпа Любіча — чарговы крок да фарміравання музейнай калекцыі, прысвечанай таму перыяду і значэнню нашых творцаў у ім. Пасля вывучэння спецыялістамі работа ўраджэнца Гродна Любіча будзе дэманстравацца на выставах Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## Запрашальнік

# «ДЖАЗАВЫЯ ВЕЧАРЫ»

### ЗБЯРУЦЬ У МІНСКУ МУЗЫКАЎ З 8 КРАІН СВЕТУ

**Арганізатары «Джазавых вечароў з Банкам БелВЭБ», якія будуць праходзіць каля мінскай ратушы па суботах з 23 чэрвеня па 7 ліпеня, абвясцілі музычную праграму фестывалю. Удзел у шостым яго сезоне возьмуць інструменталісты і вакалісты з Беларусі, Расіі, Ізраіля, Германіі, Францыі, Бразіліі, Кубы і ЗША.**

Наогул, кожная з музычных субот сёлета будзе тэматычная, а ўсе вечары аб'яднае джазавая п'еса, якую добра ведаюць прыхільнікі гэтага жанру.

**23 чэрвеня** — «Лацінаамерыканскі джаз». У праграме выступяць Жаандэр Сантас — вакал, гітара (Бразілія), Алекс Сіпягін — труба (ЗША), Аляксей Losh Малахаў — саксафон (Германія), Уладзімір Міхновіч — саксафон (Беларусь), Дзмітрый Бударын — трамбон (Расія — Беларусь) у суправаджэнні Premier Orchestra, а таксама Minimal Groove Band (Беларусь).

**30 чэрвеня** — «Традыцыі і сучаснасць». Публіка пачуе музычныя напрацоўкі Claus Reichstaller nuartett (Германія), Jonah Levine Collective (ЗША) і «Квартэта Паўла Арлова» (Беларусь — Расія).

Заключны вечар **7 ліпеня** — «У джазе толькі дзяўчаты». Сваю творчасць прадставяць слухачам Camelia Ben Naceur Trio (Францыя — Куба), спявачка Сіван Арбель (Ізраіль), Lu Krukovskaya Project (Беларусь), «Джаз-трыа Яўгеніі Лятун» (Беларусь).

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**



Фота Іны АЛЬШЭЎСКАЙ.

## Зберагаючы сваё

# НАВОШТА САДЗІЛІ «КАЗУ» Ў ЧОВЕН?

**Кніга Мікалая Маляўкі «Спадчына, або Каб не стаць манкуртам» расказвае пра штодзённы побыт нашых продкаў: як яны працавалі, святкавалі, апраналіся і размаўлялі... І што значылі для іх, на першы погляд, дробязі.**

«Спадчына» Мікалая Маляўкі стала першым выданнем, прысвечаным Году малой радзімы, якое выйшла па заказе і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі ў выдавецтве «Народная асвета». **Міністр інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ** адзначыў, што кожны чалавек мае сваю маленькую Бацькаўшчыну, якая ў той жа час з'яўляецца часткай агульнай краіны:

— Гэты год дае нам добрую магчымасць не толькі ўспомніць пра родныя мясціны, але і зрабіць для іх нешта важнае і карыснае, нягледзячы на ўзрост, прафесію або пасаду. Вельмі сімвалічна, што першай кнігай, прысвечанай Году малой радзімы, стала менавіта «Спадчына», якая звяртаецца да вытокаў і традыцый нашага народа, без ведання якіх немагчыма будучыня нацыі. Мы будзем і далей падтрымліваць — у тым ліку фінансава — такія выдавецкія праекты, — запэўніў міністр.

Кніга разлічана на дзяцей і падлеткаў, таму аўтар звяртаецца да чытача на нязмушанай, вобразнай мове. У кнізе прыказкі, прымаўкі, загадкі, лірычныя аўтарскія адступленні, якімі Мікалай Маляўка малюе «абразкі» людзей мінулага часу. Але асноўная мэта кожнага раздзела — раскрыць перад чытачом тыя сэнсы, якія хаваліся ў побытавым жыцці вясковага чалавека мінулых вякоў. Чытач быццам праходзіць поруч з аўтарам па сялянскім падвор'і, зазірае ў хату і потым кіруецца яшчэ далей — на сенажаць, у поле, лес, на рэчку. Якімі бываюць сані? Што захоўвалі ў калодзежы? Як з дапамогай «казы» — своеасаблівай «лямпы» на носе чоўна — лавілі рыбу па начах? Пра ўсё гэта можна даznacца на старонках «Спадчыны».



— Матэрыял для кнігі я збіраў даўно. Раней ужо была выдадзена кніга «Сядзіба, або Хата з матчынай душой», але праца так захапіла, што пасля выдання ніяк не мог спыніцца, усё назапашваў новую інфармацыю, — расказвае Мікалай Маляўка. — Вось тады сябры прапанавалі арганізаваць здабытак гэтых гадоў па раздзелах, скампанаваць і стварыць яшчэ адну кнігу. Хочацца падзякаваць музею старажытнабеларускай культуры за дазвол выкарыстаць фотаздымкі з іх калекцый, фатографам, мастакам, ілюстратарам выдавецтва — без іх кніга не атрымалася б такой яркай. Вёска Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага раёна для мяне назаўсёды найпрыгажэйшы куток.



Кніга Мікалая Маляўкі прадстаўляла нашу краіну на міжнародных выставах, якія адбыліся нядаўна ў Празе, Варшаве, Санкт-Пецярбургу. Магчыма, яна стане той літаратурай, якая дазволіць іншаземным гасцям больш поўна пазнаёміцца з Беларуссю, убачыць не толькі вонкавы, але і духоўны свет нашых людзей.

— Са «Спадчыны» чытач даведаецца мноства цікавых рэчаў, з якімі б ён у іншых абставінах сутыкнуўся, бадай, толькі ў музеі, — лічыць **Барыс ЛАЗУКА, дырэктар музея старажытнабеларускай культуры НАН Беларусі.** — Музей старажытнабеларускай культуры валодае найбагацейшымі калекцыямі помнікаў этнаграфіі, народнага мастацтва, але яны маўклівыя, бо знаходзяцца на паліцах у выставачных залах. Патрэбен чалавек, які б стаў расказваць пра іх. А вось калі адкрываеш кнігу Міколы Аляксандравіча, музейныя рэчы там «атрымліваюць мову»: добрую, выразную, дапоўненую багатымі ілюстрацыямі.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**
**Фота Канстанціна ДРОБАВА**

# ПРА НАШУ РАДЗІМУ Ў ВЕРШАХ І ПРОЗЕ

Рэспубліканскі творчы конкурс юных чытальнікаў «Жывая класіка»

**У Мінску адбыўся чарговы этап рэспубліканскага творчага конкурсу юных чытальнікаў «Жывая класіка: прысвячэнне маёй Радзіме». З розных гарадоў і вёсак прыехалі ў Мінскі абласны інстытут развіцця адукацыі юныя таленты — лепшыя з 1500 выканаўцаў, якія выступалі перад гэтым у сваіх школах.**



**Урывак з аповесці Уладзіміра Ліпскага «Мая Беларусь» чытае вучаніца Маркаўскай сярэдняй школы Маладзечанскага раёна Ангеліна ВЕТЛАВА.**

Дэвіз конкурсу — «Чытаем шмат, чытаем разам, ствараем сябе і краіну!». Сэнс гэтых слоў выразна перадавалі выступленні ўдзельнікаў творчага спаборніцтва. Перад строгім журы ў аўдыторыі, запоўненай аднагодкамі, канкурсанты чыталі любімыя вершы, урыўкі з празаічных твораў беларускіх літаратараў розных часоў.

З дапамогай бацькоў і настаўнікаў вучні падрыхтавалі да конкурсу сапраўдныя тэатралізаваныя выступленні. Зразумела, галоўная ўвага была скіраваная на глыбокае пранікненне ў сэнс выбранага твора. Не меншую ролю адыгрываў артыстызм выканання. Журы звяртала ўвагу і на выбар тэксту: конкурсны твор літаратуры павінен адлюстроўваць маральныя каштоўнасці грамадства, спрыяць пашырэнню цікавасці да нацыянальнай літаратуры і культуры.

Многія чытальнікі ўзмацнялі ўражанне ад сваіх выступленняў з дапамогай трапна падабранага музычнага фону, традыцыйнага вышыванага адзення, дэкарыравалі сваю часовую «сцэнічную пляцоўку» невялічкімі прадметамі хатняга ўжытку.

Рыхтуючыся да спаборніцтваў, дзятва выбірала творы не толькі прызнаных класікаў (што вынікала з назвы конкурсу), але і паэтаў і празаікаў, якія ўвайшлі ў літаратуру параўнальна нядаўна: творы пра Радзіму, гераічны і працалюбівы народ, пра нашы цудоўныя краявіды, мінулае і будучыню. Мастацкае чытанне ацэньвала кампетэнтнае журы — члены Саюза пісьменнікаў Беларусі, дасведчаныя педагогі, спецыялісты ўстаноў адукацыі. Выступленні лепшых юных чытальнікаў з усіх абласцей можна будзе пачуць у першую нядзелю верасня на свяце Дня беларускага пісьменства.

**Яўген ПЯСЕЦКІ, фота аўтара.**



**Не меней строгімі за журы былі самі ўдзельнікі конкурсу.**

■ На сцэне

# БАГАТЫМ СТАНЕ БЕЗЗАГАННЫ

## Рускі тэатр дае парады, як зарабіць мільён еўра



**Самы складаны жанр — камедыя — увасобіўся ў новай пастаноўцы Рускага тэатра «Як стаць багатым». Мітусня, пікантныя абставіны, адносны хэпі-энд пабудаваны на, можна сказаць, класічнай схеме такога тыпу сюжэтаў: галоўны герой дзеля грошай ідзе на авантуру, яго планам увесь час перашкаджае нешта крайне бязглуздае, але, нягледзячы на ўсё, ён застаецца пераможцам. Прэм'ера спектакля адбылася ў драматычным тэатры імя Горкага 26 і 27 мая і паказала лёгкую гісторыю, дзе не можа здарыцца нічога дрэннага. Праўда, галоўны — камедыйны — складнік пастаноўкі альбо аказваецца занадта для XXI стагоддзя заезджаным, альбо губляецца ў «непастаўленай» беганіне.**

Галоўнага героя завуць Блэз Д'амбрые, ён выкідае 17 тысяч еўра за арэнду кватэры ў цэнтры Парыжа, піша карціны, выглядае іранічным, то-бок недурным, мужчынам і ў цэлым падаецца рэспектабельным персанажам. Пакуль не разумееш, што чэк на 17 тысяч долараў выпісаны з пустэчай на банкаўскім рахунку, карціны нікому з патэнцыйных пакупнікоў не патрэбны, а кватэра ў Парыжы арандавана, каб правярнуць аферу. Са сваёй каханай Жэнеўевай Блэз Д'амбрые прыдумаў план, згодна з якім ён павінен ажаніцца з дачкой багатага бізнесмена Клебера Карлье, што можа прынесці вялізны прыбытак.

Так пачынае разварочвацца клубок заганаў і распусты не самага пурытанскага грамадства, у асяродку якога ў выніку расцвітае сапраўднае каханне. Адсутнасць маральных арыенціраў назіраецца літаральна ў кожным персанажы (апроч двух). Шлюбная нявернасць, наяўнасць некалькіх палюбоўнікаў ці палюбоўніц, карыслівасць альбо звычайная неразумнасць адкрываюцца ў гуллівых паваротах сюжэта як жартаўлівыя ўмовы для камедыі палажэнняў.

Затое галоўнаму герою мы не прыпісваем адмоўныя характарыстыкі, таму што ў планаванні падману яго быццам вядзе за сабой прадпрымальная каханка-манекеншчыца. Блэз Д'амбрые, летуценны мастак, у прынцыпе ўвесь час згаджаецца на ролю вядомага, але сваю слабасць пры гэтым кампенсуе вынаходлівасцю і выкрутлівасцю. Колькасць камічных сітуацый, якія галоўны герой правакуе не па сваім жаданні, але ў якіх становіцца цэнтральным рухавіком, робіць з Блэза найбольш сімпатычнага персанажа.

Другім «чыстым» героем становіцца правінцыйная дзяўчына Мары, па замове дасланая адпаведным агенцтвам для абслугоўвання кватэры, дзе на два тыдні прапісаўся Блэз. На пачатку з Мары звязаныя жарты, што базуюцца на нявіннасці ў вялікім горадзе, артадаксальнай цётцы і прадказальнай прастадушнасці, але ў выніку ўсё перакрываецца яе прадпрымальнасцю, сур'ёзнасцю і натуральнай эмпатыяй да галоўнага героя.

У гэты час аказваецца, што Клебер Карлье з'яўляецца палюбоўнікам Жэнеўевы, што апроч яе ў багача ёсць стасункі з гарачай іспанкай Пепітай, што ў Жэнеўевы, апроч Клебера і Блэза, ёсць нейкі бландзін, што жонка і дачка Клебера таксама маюць свае «прагрэсіўныя» інтарэсы. Карацей, сюжэт паказвае цэлы клубок узаемасувязяў, дзе кожная становіцца сімвалам падману і эгаізму.

Таму натуральна — калі ў спектаклі ўжо пайшоў такі дыдактычны матыў, — што злосная афера Блэза і Жэнеўевы не атрымліваецца, у тым ліку таму, што сам галоўны герой «расце» падчас спектакля і больш у такім спосабе заробку не мае патрэбы. Відавочна таксама, што сама чысціня Мары, якая трапіла ў заганную французскую сталіцу і закахалася ў Блэза, паспяхова, гуляючы, вырашае пытанні, прыцягвае грошы і «арганізоўвае» цэлы мільён еўра.

У спектаклі, пастаўленым Сяргеем Кавальчыкам па п'есе Клода Манье «Блэз», захоўваецца адзінства месца: усе камічныя сітуацыі ўласна і адбываюцца ў кватэры з пустым барам. Але тут ёсць незлічоная колькасць дзвярэй, у якіх героі ўвесь час блытаюцца, што дазваляе абыграць прастору дзякуючы цэламу шэрагу загадкавых памяшканняў, падзеі ў якіх мы бачыць не можам.

Пастаноўка «Як стаць багатым» мае быццам іранічную падаплёку, але на грунтоўную базу і падсэнсы не прэтэндуе. Відаць, Сяргей Кавальчык хацеў пацешыць публіку і толькі, таму сабраў «найбольш бяспройгрышныя» жэсты і гумарэскі, якія насамрэч выглядаюць заезджанымі, а ў спектаклі з невытрыманым рытмам і паўзамі — нават наіўнымі. У тым сэнсе, што яны маюць выглядаць смешнымі, але такімі не з'яўляюцца. Зрабіць некалькі аднолькавых рухаў, разрываючыся паміж тэлефонам і дзвярыма, у якія звоняць, ужо не смешна. Таксама, як паспешліва хаваць сваіх гасцей, калі нехта стаіць, лічы, на парозе. Як стукаць дзіўнаватую гаспадыню кватэры падносам па галаве, каб яна адключылася і, пажадана, замаўчала. І стукаць паўторна. І яшчэ раз.

Нездарма камедыя лічыцца адным з самых складаных жанраў, бо спалучыць усе тэатральныя складнікі такім чынам, каб кожная гумарыстычная сцэна зайграла сапраўды смешнымі палажэннямі, вымагае вялікіх высілкаў. Галоўную і ў гэтым выпадку, відома, надзвычай адказную ролю, бо на ёй трымаецца ўвесь спектакль, выконвае Уладзімір Глотаў. Акцёр, што татальна зацёрся ў недапрацаваных рытміцы, жэстах і цэларухах, хоць патэнцыял да безумоўнай камедыйнасці мае. Няма ў галоўным герoі і, прабачце, стрыжня, які павінен аб'ядноўваць увесь кругаварот персанажаў і вызначаць іх. Фармальна яны, канешне, усе вызначаюцца праз стасункі з Блэзам, але пакуль Д'амбрые ніяк не выстаўляе свой характар наперад, усе ролі тут — роўныя.

Спектакль «Як стаць багатым» сваю выключна забаўляльную функцыю такім чынам выконвае толькі напалову, і вяртацца ў гэтую кватэру з пустым барам, каб не апраўдаць свае надзеі на гамерычны смех, не хочацца. «Як стаць багатым» — пастаноўка, што павінна была стаць проста камедыяй, але і камедыяй не стала.

**Сафія ПАЛЯНСКАЯ** ■

# АКЦЭНТЫ ДАБРЫНІ




## Беларускія мастакі ўзялі ўдзел у дабрачыннай акцыі «Любоў дзейнічае»

**Мастацтва валодае неверагоднай сілай: можа супакоіць ці, наадварот, абудзіць да дзеяння, можа дапамагчы знайсці адказ на складанае пытанне, а можа і ратаваць жыццё. У галерэі-салоне «Арт Хаос» ажыццявілі праект «Любоў дзейнічае», асноўная мэта якога — збор грашовых сродкаў на дабрачынныя патрэбы ад продажу мастацкіх твораў беларускіх аўтараў.**

Праект з самага пачатку атрымаў водгук з боку айчынных творцаў. Лейтматывам усяго мерапрыемства была думка аб тым, што мастацтва можа быць не толькі творчым актам майстра, але і сацыяльна адказным учынкам. На выстаўцы было прадстаўлена каля трыццаці мастацкіх твораў. Некалькі работ прадставіла жонка мастака Рамана Кароткіна, які сем гадоў таму памёр ад анкалагічнага захворвання.

— Ад пачатку адкрыцця галерэі мы практыкуем дабрачынныя акцыі. Толькі спярша яны ладзіліся ў вузкім фармаце — продаж адной карціны. Потым мы вырашылі пашырыцца і арганізавалі больш маштабнае мерапрыемства, — расказвае **дырэктар галерэі-салона «Арт Хаос» Лілія ЛУКАШЭНКА.** — З мастакамі работа атрымалася зладжаная і арганізаваная. Мы тэлефанавалі ў асноўным тым аўтарам, з якімі працуем. Усе ахвотна згаджаліся. А потым інфармацыя пра наш праект разляцелася па арт-супольнасці, і майстры тэлефанавалі самі, прапануючы выставіць творы. Да пачатку праекта на сайце былі размешчаны работы, і іх можна было забраніраваць. На момант адкрыцця выстаўкі ўсе работы, прадстаўленыя мастакамі, былі выкупленыя. Мы спецыяльна арганізавалі працэс продажу загадзя, каб на адкрыцці мець канчатковы вынік і разумець, якой колькасцю сродкаў можам дапамагчы.

Атрыманыя сродкі будуць накіраваныя дзвюм арганізацыям: Фонду дапамогі дзецям у гонар святога Іаана Рускага, які падтрымлівае дзяцей з псіханеўралагічнымі захворваннямі, і сацыяльна-дабрачыннай установе з Гродна «Цэнтр дапамогі жыццё», якая аказвае паліятыўную дапамогу людзям з анкалагічнымі захворваннямі.

У праграме ўзялі ўдзел дзеці з асаблівасцямі развіцця, быў паказаны фрагмент спектакля «Маленькі прынц» тэатра «Радасць» пад кіраўніцтвам акцёра Рускага драматычнага тэатра імя А. М. Горкага Аляксандра Ждановіча. Вельмі важна, што ў дзяцей была магчымасць асабіста падзякаваць арганізатарам, мастакам і пакупнікам. Гэта той самы выпадак, калі дабрыня яднае, заражае веру ў жыццё, дапамагае ўпарта ісці да сваёй мэты.

— Гэта незвычайны праект. Ён атрымаўся эмацыянальны і шчыры. Наведвальнікі, гледзячы на выступленні дзяцей, на дапамогу якім будуць накіраваны дабрачынныя сродкі, праніклася дабром. Мне здаецца, нават пераасэнсавалі ў гэтыя хвіліны сваё жыццё, — падкрэслівае Лілія Лукашэнка. — Мы і далей будзем арганізоўваць дабрачынныя выстаўкі, тым больш што ў нас ужо ёсць станоўчы досвед і падтрымка мастакоў.

**Вікторыя АСКЕРА.**



## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже трехкомнатной квартиры в г. Москва, принадлежащей ОАО «БМЗ – управляющая компания холдинга «БМК»

**Лот № 250518001.** Трехкомнатная квартира с кадастровым (или условным номером) 77:07:0001002:22536. Г. п. – 1986. Назначение: жилое. Общая площадь – 75,3 кв. м. Жилая площадь – 46,4 кв. м. Этаж – 3. **Местоположение лота**: Российская Федерация, г. Москва, ул. Осенняя, д. 22, кв. 12. **Начальная цена (без учета НДС), рос. руб. – 14 779 686,14. Задаток, рос. руб. – 1 500 000,00. Шаг электронных торгов – 5 %.**

**Дата и время начала проведения электронных торгов 29.06.2018 в 10.00 (по времени на ЭТП «ТОРГИБЕЛ»)**

Условия электронных торгов содержатся на сайте Организатора электронных торгов ino.by и на ЭТП «ТОРГИБЕЛ».

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом ЭТП «ТОРГИБЕЛ» с соблюдением требований Положения о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденных постановлением Совета Министров РБ № 608 от 12 июля 2013 г.

**Продавец:** ОАО «БМЗ – управляющая компания холдинга «БМК», 247210, Гомельская обл., г. Жлобин, ул. Промышленная, 37, тел. 8 (02334) 5-45-20, факс 8 (02334) 3-10-70.

**Организатор электронных торгов и оператор электронной торговой площадки:** РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, тел. 8 (017) 306-00-57.

**Электронный адрес ЭТП:** http://торги.бел.

Задаток в российских рублях перечисляется на р/с BY57BLBB30120190055182001006 в ОАО «Белинвестбанк», BIC банка BLBBBY2X, г. Минск, пр. Машерова, 29, не позже срока окончания приема документов на участие в электронных торгах. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в электронных торгах по продаже квартиры, принадлежащей ОАО «БМЗ – управляющая компания холдинга «БМК» (лот № 250518001), проводимых 29 июня 2018 г. Аккредитация, регистрация и участие в электронных торгах осуществляется на ЭТП «ТОРГИБЕЛ». **Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами**: 26.06.2018 в 11.00.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Предметом. Контактное лицо для осмотра Предмета электронных торгов: Бондаренко Владимир, тел. +74956496537, доб. 200. Детальная информация о порядке участия в повторных электронных торгах размещена на сайте ЭТП «ТОРГИБЕЛ» (http://торги.бел.).

Первое, полное, извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 15.02.2018

**Организатор электронных торгов: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: tb@ino.by**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего УП «Минскзеленстрой», проводимых на ЭТП «ТОРГИБЕЛ»

| № Лота | Описание предмета электронных торгов | Начальная цена с учетом НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Лот № 220518001** | Автомобиль (самосвал) MAZ-555102-223. Г. в. – 2006. Цвет – белый. Кузов Y3M55510260009565. Пробег – 285 085 км | 2 817,61 | 282,00 |
| **Лот № 220518002** | Автомобиль (самосвал) MAZ-555102-223. Г. в. – 2006. Цвет – белый. Кузов Y3M55510260009582. Пробег – 345 311 км | 2 817,61 | 282,00 |
| **Лот №220518003** | Автомобиль (самосвал) MAZ-555102-223. Г. в. – 2006. Цвет – белый. Кузов Y3M55510260009584. Пробег – 325 974 км | 2 817,61 | 282,00 |
| **Лот № 220518004** | Автомобиль (самосвал) MAZ-555102-223. Г. в. – 2006. Цвет – белый. Кузов Y3M55510260009606. Пробег – 272 337 км | 2 817,61 | 282,00 |
| **Лот № 220518005** | Автомобиль (самосвал) MAZ-555102-220. Г. в. – 2007. Цвет – серый. Кузов Y3M55510270011824. Пробег – 212 464 км | 2 794,58 | 280,00 |
| **Лот № 220518006** | Погрузчик Амкодор 332 С-4. Г. в. – 2007. Заводской № машины Y3A332C4002070094 | 5 999,48 | 600,00 |

**Местонахождение лотов**: г. Минск, ул. Одоевского, 58. **Шаг электронных торгов** – 5 %

**УСЛОВИЯ**

1. Победитель электронных торгов (Претендент на покупку) должен заключить с Продавцом договор купли-продажи предмета (предметов) электронных торгов в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола.
2. Условия оплаты стоимости приобретенного на электронных торгах предмета (предметов) электронных торгов: 100 % предоплата в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня подписания договора купли-продажи.
3. Самовывоз предмета (предметов) электронных торгов осуществляется Победителем электронных торгов (Претендентом на покупку) по адресу: г. Минск, ул. Одоевского, 58.
4. Победитель электронных торгов (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору электронных торгов стоимость затрат на организацию и проведение электронных торгов на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней после утверждения протокола о результатах электронных торгов.
5. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя электронных торгов

**Дата и время начала проведения электронных торгов 06.07.2018 с 10.00 (по времени на ЭТП «ТОРГИБЕЛ»)**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом ЭТП «ТОРГИБЕЛ» с соблюдением требований Положения, утвержденного постановлением Совета Министров РБ № 608 от 12 июля 2013 г.

**Продавец**: Производственное коммунальное унитарное предприятие «Минскзеленстрой» 220092, г. Минск, ул. Одоевского, 58, т/ф. 8 (017) 213-05-48.

**Организатор электронных торгов и оператор электронной торговой площадки:** РУП «Институт недвижимости и оценки» 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, к. 7, тел. 8 (017) 306-00-57.

**Электронный адрес ЭТП:** http://торги.бел.

Задаток перечисляется на р/с BY68BPSB30121543370789330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, не позже срока окончания приема документов на участие в электронных торгах. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в электронных торгах по продаже имущества, принадлежащего УП «Минскзеленстрой» (лот № ___), проводимых 6 июля 2018 г. Лицо, желающее принять участие в электронных торгах в отношении нескольких предметов электронных торгов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из этих предметов. Аккредитация, регистрация и участие в электронных торгах осуществляется на ЭТП «ТОРГИБЕЛ». **Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами:** 29.06.2018 в 11.00.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Предметами. Контактное лицо для осмотра Предметов электронных торгов – Чечко Анатолий Викторович, тел. 8 (029) 650-73-55. Детальная информация о порядке участия в электронных торгах размещена на сайте ЭТП « ТОРГИБЕЛ » (http://торги.бел.)

**Организатор электронных торгов: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ

**Коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Запад» доводит до сведения заинтересованных лиц о внесении изменений в проектную декларацию о строительстве жилых помещений объекта «Реконструкция застройки территории в районе ул. Михалово, Алибегова.» Жилой дом № 3 по генплану»,** опубликованной в газете «Звязда» № 153 (28517) от 11.08.2017, № 2 (28618) от 04.01.2018

Предполагаемый срок ввода жилого дома в эксплуатацию – 6 августа 2018 года.

УНП 192400611

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 421/С-7277 (назначение – здание многоквартирного жилого дома, наименование – жилой дом), площадью 311,8 кв. м, расположенное по адресу: г. п. Вороново, ул. Юбилейная, 3Б

Лот 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 421355100003000764, (назначение – земельный участок для обслуживания многоквартирного жилого дома), площадью 0,1815 га, расположенном по адресу: г. п. Вороново, ул. Юбилейная, 3Б. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5,2, площадью 0,0024 га

Начальная цена продажи – 95 731,48 (девяносто пять тысяч семьсот тридцать один рубль сорок восемь копеек) с учетом НДС

Сумма задатка – 4 787 руб. (четыре тысячи семьсот восемьдесят семь рублей)

Продавец – Вороновский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231391, Гродненская область, г. п. Вороново, ул. Калинина, 4, 8-01594-217-83

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – 100 % предоплата. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 21 июня 2018 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ, его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представителем организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя, и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 07.04.2018 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 18 июня 2018 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by*

## Паритетбанк

**Открытое акционерное общество «Паритетбанк» (Республика Беларусь, 220002, г. Минск, ул. Киселева, 61а) сообщает, что 22 июня 2018 г. в 10.00 в соответствии с решением Наблюдательного Совета ОАО «Паритетбанк» состоится внеочередное общее собрание акционеров в очной форме по адресу: г. Минск, ул. Киселева, 61а, зал заседаний, 3-й этаж**

**Повестка дня:**

Об избрании Наблюдательного Совета.

Список лиц, имеющих право на участие во внеочередном общем собрании акционеров, составляется на основании реестра акционеров, сформированного по состоянию на 6 июня 2018 г.

Лица, имеющие право на участие во внеочередном общем собрании акционеров, могут ознакомиться с информацией (документами) по вопросам повестки дня 21 июня 2018 г. с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Киселева, 61а, каб. 306, а также 22 июня 2018 г. по месту проведения внеочередного общего собрания акционеров при прохождении регистрации.

Регистрация лиц, имеющих право на участие во внеочередном общем собрании акционеров, будет проводиться 22 июня 2018 г. по месту проведения внеочередного общего собрания акционеров с 9.20 до 9.50 при предъявлении документов, удостоверяющих личность (подтверждающих их полномочия).

Телефон для справок: 237 76 79.

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь от 27 октября 2014 № 5. УНП 100233809

## Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | Минское районное потребительское общество, г. Минск, ул. Бровки, 24 |

**Предмет аукциона**
**Местоположение – Минская обл., Минский р-н**

| Наименование | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес (населенный пункт) |
|---|---|---|---|
| **Лот №1** | | | |
| **Магазин** | 101,6 кв. м | 600/С-114084 | Щомыслицкий с/с, д. Строчица |
| Составные части и принадлежности: пристройка, сарай, уборная | | | |
| **Сведения о земельном участке**: пл. **0,0593** га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания зданий и сооружений магазина № 15 с установленными ограничениями (водоохранная зона водохранилища Птичь) | | | |
| **Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 34 900,00 бел. руб.** (снижена на 25 %) | | | |
| **Лот №2** | | | |
| **Здание магазина № 6** | 71,5 кв. м | 600/С-73407 | Боровлянский с/с, д. Королев Стан |
| Составные части и принадлежности: четыре холодных пристройки | | | |
| **Сведения о земельном участке**: пл. **0,0671** га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания магазина № 6 | | | |
| **Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 59 900,00 бел. руб.** (снижена на 13 %) | | | |
| **Лот № 3** | | | |
| **Заготовительный павильон** | 257,2 кв. м | 600/С-153282 | г. Заславль, ул. Набережная, д. 2Г |
| Составные части и принадлежности: пристройка | | | |
| **Сведения о земельном участке**: пл. **0,0534** га, предоставлен продавцу на праве аренды для размещения объектов розничной торговли (срок действия по 24.09.2018). Ограничения (обременения) прав: водоохранная зона Заславского водохранилища, охранная зона линий электропередачи напряжением до 1000 Вольт (пл. 0,0030 га) | | | |
| **Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 59 000,00 бел. руб.** (снижена на 35 %) | | | |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30** (тридцати) дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущие извещения о проведении аукционов опубликованы в газете «Звязда» от 15.05.2018

**Аукцион состоится 20.06.2018** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и **необходимые документы принимаются по 18.06.2018** до 17.00 по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8 029 317-95-42. www.cpo.by**. Email: auction@cpo.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ГРАЖДАНАМ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНЫХ ЖИЛЫХ ДОМОВ

ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА – ИВЕНЕЦКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ВОЛОЖИНСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ

| № п/п | Адрес земельного участка | Площадь земельного участка | Наименование инженерных сетей | Начальная цена (бел. руб.) | Задаток (бел. руб.) | Расходы по документации (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Провжалы, кадастровый номер 622084317601000106 | 0,15 га | Вблизи подъездные пути, ЛЭП, рядом лес, земельный участок имеет ограничения в использовании земель: водоохранная зона | 2184,30 | 328 | 1236,19 |
| 2 | д. Далидовичи, кадастровый номер 622084304601000066 | 0,25 га | Подъездные пути, водопровод, газопровод, ЛЭП, рядом лес. Земельный участок с ветхими строениями, подлежащими сносу победителем аукциона | 5639,74 | 846 | 1372,32 |
| 3 | д. Петрусовщина, 4А, кадастровый номер 622084314701000088 | 0,25 га | Вблизи подъездные пути, рядом лес, ЛЭП | 3893,31 | 584 | 1363,33 |
| 4 | д. Петрусовщина, 4Б, кадастровый номер 622084314701000087 | 0,25 га | Вблизи подъездные пути, рядом лес, ЛЭП | 3893,31 | 584 | 1348,63 |
| 5 | д. Станюшки, кадастровый номер 622084321101000036 | 0,25 га | Вблизи подъездные пути, рядом лес, ЛЭП | 3286,56 | 493 | 1221,49 |
| 6 | аг. Сивица. ул. Ивенецкая,15А, кадастровый номер 622084320101000172 | 0,1686 га | Вблизи подъездные пути, рядом лес, ЛЭП, газ, водопровод | 4235,14 | 635 | 82,04 |
| 7 | д. Углы, ул. Лесная, кадастровый номер 622084323101000085 | 0,25 га | Подъездные пути, ЛЭП, рядом лес, земельный участок имеет ограничения прав в использовании земель: водоохранная зона, территория заказников и памятников природы, а также земельный участок с ветхими строениями, подлежащими сносу победителем аукциона | 2851,73 | 428 | 1379,35 |
| 8 | д. Макасичи, кадастровый номер 622084604601000063 | 0,2000 | Вблизи ЛЭП, водопровод, земельный участок имеет ограничения прав в использовании земель: водоохранная зона | 3543,42 | 532 | 82,04 |

Задаток перечисляется на р/счет № BY94AKBB36006140305010000000 в ГУ МФ РБ по Минской области ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код AKBBBY2X, УНП 600537220 Ивенецкий сельский исполнительный комитет, код платежа – 04901.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации и объявления в газету.

Аукцион состоится 6 июля 2018 года в 10.00 по адресу: Воложинский район, г. п. Ивенец, пл. Свободы, 2.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются до 5.07.2018 г. до 17.00 по адресу: Воложинский район, г. п. Ивенец, пл. Свободы, 2. Контактные телефоны: (8 01772) 53388, 51843

# ПРАЦА І РУКІ — ДОБРЫЯ ЗАРУКІ


Фота носіць ілюстрацыйны характар.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## А ВОСЬ ГЭТАГА ЁН НЕ ЧАКАЎ...

Ніхто ніколі не бачыў, каб Цімох Стрык сядзеў проста так без справы. То плёў нейкія кошыкі ці кашы, то ладзіў пляцень вакол агарода, то завастраў сякеру або нож-складанчык. Здавалася, што рукі яго не ведалі стомы, што яны самі прасіліся ў работу, і ён ім не адмаўляў. Ды як тут адмовіш, калі сям'ю карміць трэба? Шасцёра душ у ёй: ён з жонкай, дзве дачкі канца трыццатых гадоў і дзве — пасляваеннага. Якія з іх, малечы, памочнікі ў мужчынскай справе? Добра яшчэ, што разам з маці каля дому завіхаюцца ды з пустазеллем на сотках змагаюцца. А так усё на ім, які кульгавым інвалідам-сяржантам з вайны вярнуўся, ляжыць.

У калгасе, куды на працу хадзіў Апанасавіч, капейчынай, без якой не купіш дзеўкам ні апранахі, ні абутку, ні нешта неабходнае для сябе, нават не пахла. Бо там пры разліку за работу тон бяруць голыя палачкі-працадні, і калі б не ўласны агародчык, які даваў магчымасць (хай сабе па мінімуме) быць пры кавалку хлеба і бульбіне, дык сям'я Цімоха Стрыка сядзела б на галодным пайку.

Ён добра запомніў мудрыя бацькавы словы: праца і рукі — добрыя зарукі. Яны не падвядуць у любой жыццёвай сітуацыі. Яны, як бы ні было цяжка спачатку, у рэшце рэшт выведуць на бальшак. І яшчэ: удача прыходзіць да таго, хто яе чакае. Хто ў яе безагляднае верыць. Таму ў тыя кашы па азярынках ды сажалках рыбу затоптваў, каб не толькі для сябе, але і ў райцэнтры прадаваць; і лазовую, і крушынавую кару драў — высушваў, каб потым у райспажывтаварыства здаць. Ды многа што яшчэ рабіў дзеля той капейчыны.

Падспор'е, як ні кажы, але хочацца мець нешта перспектыўнае, надзейнае, якое б дазволіла больш устойліва адчуваць сябе ў матэрыяльным плане. От, калі б гэта была карова, а ў падмогу да яе — свінаматка. Тады б лягчэй было дыхаць. Але, як кажуць, марыць — не шкодна. Шкодна не марыць. А пакуль Цімох Апанасавіч завіхаўся самай звычайнай будзённасцю, якой запаўняліся ўсе дні. Адзін з іх, позневосеньскі, які выявіўся пасля, аказаўся зусім нетыповы, шчаслівa непрадказальны. Бо на цэлых паўгода асвятліў яго сям'ю радасцю. А было гэта так.

З канца верасня пачалі лупіць зацяжныя дажджы, якія прыхапілі кастрычнік і пачатак лістапада. Вада ў рэчках паднялася так, што ледзь не дасягнула вясновага ўзроўню. А потым падкраліся безветраныя маразы і скавалі водныя прасторы такім слізкім лёдам, па якім хадзіць было небяспечна. Ды гэта было наруку Цімоху Стрыку. Ён, нядоўга думаючы, вырабіў з бляхі дзёркі, прывязаў іх да керзачоў і смела браў у іх патрэбныя кірункі.

Часцей за ўсё гэта былі берагі рэчкі, дзе пад празрыстым, як шкло, лёдам спакойна сябе адчувалі мянтузы, шчупакі ды плоткі. Супраць іх Цімох пускаў спецыяльна змайстраваную чакуху і ніколі не заставаўся без рыбы. Наступны яго маршрут пралягаў на засаджэскі луг, дзе разраслося вербалоззе. Тут у ход ішла сякера, і дадому ён даставіў цэлы воз тоўстага лазняку. Для ацяплення сваёй хаты і на продаж яўрэям, якія казалі так: лазовыя дровы — не дровы, хоць ракам у грубе стаяць, ды жарка гараць. І ахвотна куплялі іх.

Дык вось, у той вышэйназваны дзень Апанасавіч вырашыў адправіцца ў лес па смалякі, для чаго прыхапіў сякеру, некалькі мяшкоў і на ўсякі выпадак — чакуху (каб праверыць, ці ёсць рыба на азярыне). Усё яму тады ўдалося: і смалістых карчоў здабыў, і пяць ладных шчупакоў. З гэтым і ўзяў курс дадому. Наваколле ўжо ахапіў змрок.

Азярыну тую ад таксама замерзлага Сожа аддзяляла трыццаціметровая палоска лугавіны. Ісці ў тых дзёрках па зямлі было нязручна, і вясковец «распрог» боты, вырашыўшы абламаць куст каліны, які прыкмеціў яшчэ з раніцы. Завіхаючыся каля яе, ён раптам пачуў ззаду сябе нейкі шоргат. Азірнуўся і ледзь не самлеў: на яго нясліся два нейкія цені-прывіды. З усіх ног шмаргануў Цімох Струк на азярыну (добра, што яна была блізка), і керзачы вынеслі яго далёка на берага. Два ж звяругі з разгону ўляцелі на слізкі лёд і, раскірэчыўшыся, ёрзаліся на ім.

У Апанасавіча ад жаху валасы сталі дыбам. Ваўкі! Круцяцца на месцы, не могуць падняцца на капыты, бездапаможныя. Што рабіць? Даваць драпака, покуль не позна, нервова падумаў Стрык і прыладзіў да ботаў дзёркі, якія пакідаў на санках. Упрогся ў іх і рушыў у бок Сожа. Перш чым ступіць на тую паласу, азірнуўся. Вепрукі па-ранейшаму коўзаліся на лёдзе, і ён, крыху вагаючыся, прыхапіўшы чакуху і сякеру, пайшоў да іх. Хвілін пяць прыглядаўся. Думаў. Пудоў па шэсць-сем кожны. Грозныя звяругі, а на лёдзе, без снегу, бездапаможныя. Не скора агоўтаюцца. Не скора... А што, калі...

З гэтымі думкамі мужык (адкуль і ўзялася смеласць?) так чакухай пачаў куёшыць клыкастага дзіка па галаве, што той хутка заціх. Скінуўшы мяшкі са смалякамі і пагрузіўшы на санкі вепрука, па дарозе дадому ён шкадаваў, што не прыкончыў і таго, другога звера. І думаў, як будзе апраўдвацца, калі міліцыі стане вядома пра яго здабычу. Ды нічога: скажа, што абараняўся ад нападу. А яшчэ вырашыў заўтра ранічкай зноў завітаць на азярыну па лёгкую здабычу: не пашкодзіць яна сям'і. Будзе добрай паядухай.

Але наступны дзень Цімоха Стрыка расчараваў. Бо ноччу ваўкі так растрыбушылі таго дзіка, што не пакінулі Апанасавічу ніводнага кавалачка свежаніны. А да яго смалякоў яны не праявілі ні грама цікавасці...

## АНГІДРЫД ТВОЙ ПЕРАКІС МАРГАНЦУ

Нядаўна чарговы раз пабываў у сваім родным Чачэрску. Перш чым наведацца ў сям'ю малодшага брата, прайшоў па Замкавай гары, дзе стаіць помнік загінулым у час Вялікай Айчыннай вайны вызваліцелям горада; па парку, адкуль адкрываюцца заснежаныя, аж да самага лесу, краявіды сцішаных прырэчных (Чачэры і Сожа) лугоў; некалькі хвілін у задуменні пастаяў каля будынка школы, дзе вучыўся. Так, сёлета споўніцца 62 гады, як мы, 28 выпускнікоў дзясятага «А» класа, адчулі за сваёй спінай крылы для самастойнага жыцця і разляцеліся хто куды. З наказамі-павучаннямі, якія нам далі нашы бацькі і настаўнікі. Якія нас выхоўвалі не адзін і не два гады. Якіх няма ўжо на гэтым свеце. Якім мы шчыра ўдзячны і якім многім абавязаны. І якіх мы ніколі не забудзем.

Яны былі розныя на характары, але нязменныя ў адным: кожны валодаў высокім педагагічным майстэрствам і ўмеў прыпаднесці свой прадмет так, што ты яго грунтоўна засвоіш і не правалішся пры паступленні ў тэхнікум ці вышэйшую навучальную установу. Гэта я ведаю з прыкладу свайго класа: хто меў намер вучыцца пасля школы далей, той і ажыццявіў задуманае без асаблівых цяжкасцяў.

Так, нельга было не захапляцца ўрокамі выкладчыка гісторыі Уладзіміра Мікалаевіча Новікава. Ён не даваў нікому з нас ні хвіліны для расслаблення і трымаў клас у напружанні. Часта пры апытанні зададзенай тэмы ў яго адначасова былі задзейнічаны тры чалавекі: двое пісалі даты на дошцы, а трэці адказваў на пытанні. Ды не толькі самога настаўніка, але і вучняў, якіх ён тут жа прызначаў для гэтага. Такім чынам, працаваў увесь клас. Бывалі выпадкі, калі тэму наступнага ўрока Уладзімір Мікалаевіч не тлумачыў (маўляў, самі дома прачытаеце па падручніку), а прыводзіў такія падрабязнасці да той тэмы, якія ён вывуджваў са спецыяльнай літаратуры, недаступнай для нас.

А франтальныя апытанні... Гэта калі пасля заканчэння чвэрці на адным уроку трэба было ўспомніць увесь пройдзены матэрыял. На партах пуста, а адказы кароценькія (з месца не трэба ўставаць), і па трох-чатырох іх настаўнік кожнаму вучню (кожнаму!) выстаўляе адзнаку, якая можа быць вырашальная (ніжэйшая ці вышэйшая за бягучыя ацэнкі). Нельга пераліпчыць і іншыя педагагічныя прыёмы гісторыка. Але пра яшчэ адзін скажу. Ён мог аднаго і таго ж вучня або некалькіх адразу коратка апытваць на кожным уроку, і мы канстатавалі: «ловіць» на двойку. Таму і вучылі яго ўрокі як след. І расслабляліся, калі ў жартаўліва-сур'ёзным тоне ён прамаўляў: сёння ты зарабіў «чатыры» (або «тры» ці «пяць») плюс-мінус адна трыста дваццаць пятая. Ці нешта падобнае. А было і так, калі прапаноўваў (з абгрунтаваннем, вядома) даць сваю ацэнку таму, хто стаяў каля дошкі, прызначанаму ім вучню. Такая вось «гульня» нам вельмі падабалася.

Шмат пазнавальнага і цікавага было на ўроках настаўнікаў: фізікі — Івана Маркавіча Гарбачова, у каторага атрымаць «чацвёрку» было ой як няпроста; рускай і беларускай мовы — Яўгеніі Фёдараўны Пазняковай і Фаіны Захараўны Левінай; матэматыкі — Вольгі Васілеўны Ермаковай; нямецкай мовы — Валянціны Іванаўны Ліпчанскай; ваеннай падрыхтоўкі — былога партызана — Івана Пракопавіча Зубава; фізкультуры — афіцэра ў адстаўцы Аляксандра Фёдаравіча Бахвалава.

Асобна хачу расказаць пра выкладчыка геаграфіі Майсея Барысавіча Кадзіна, чалавека-эрудыта, які, здаецца, ведаў усё і якога мы лічылі трохі дзіваком. Ні ў адной школе раёна не дэманстраваліся тады дыяфільмы, а ў Кадзіна — калі ласка. Прычым з такімі вось нюансамі: пры апісанні экранных Каўказскіх гор ён казаў (жартам ці ўсур'ёз — не ведаем), што з іх ён па-заліхвацку з'язджаў на лыжах, а на спуску яго чакала Роза Самуілаўна (яго жонка, настаўніца батанікі). Прызнацца, мы не верылі гэтаму, бо на тых гарах можна было скруціць галаву, а Майсей Барысавіч — жывенькі і вясёленькі.

Седзячы спінай да карты і тлумачачы новы матэрыял, ён беспамылкова паказваў указкай тыя краіны, рэкі, гарады, якія называў. І патрабаваў амаль на кожным уроку вучняў, якіх апытваў, паказаць самую паўднёвую кропку Савецкага Саюза — горад Кушку. І нерваваўся, калі той блукаў па карце. Тады садзіўся на стул і торкаў указкай у названую кропку. Гэтак жа беспамылкова.

А вось што не любіў Майсей Барысавіч, дык гэта тое, калі даведваўся, што вучаніцы ходзяць на танцы. Варта было перарoстку Івану Сініцыну пры выкліку да дошкі той ці іншай дзяўчыны з месца сказаць, што яна хадзіла на танцы, як настаўнік засыпаў яе такімі пытаннямі, якія нярэдка «пахлі двойкамі». І яшчэ: Кадзін не вытрымліваў, калі нехта парушаў дысцыпліну (дурэў на перапынку, размаўляў на ўроку, не слухаў яго тлумачэнні). У падобных выпадках ён стукаў указкай па стале і ці то ўсур'ёз, ці то ў жарт (цяжка было разабраць) заяўляў усяму класу: «Калі вы будзеце сябе так паводзіць, дык я з вас «вату» зраблю». У тым сэнсе, напэўна, што будзем «мякенькімі».

Добра помніцца мне і настаўнік хіміі Барыс Навумавіч Фаерман. Ён жартаўніком быў. Іншым разам пры ўваходзе ў клас, калі мы яшчэ не адышлі ад шумлівага перапынку, казаў: «Вы што, балдзелі і не ведалі, калі з-за вугла паказаўся нос, дык праз тры хвіліны з'явіцца сам Фаерман?» Калі хто не вывучыў урок ці нешта ўтварыў непрыстойнае, Барыс Навумавіч у адносінах да таго прымяняў «хімічную» лаянку: ангідрыд твой перакіс марганцу! Аднойчы ўжыванне яе прывяло да страшэннага скандалу. А было гэта ў восьмым класе.

Лёнька Маглышаў «плаваў» на ўроку, і, калі настаўнік пасля ўказанай «лаянкі», пачаў выстаўляць яму адзнаку ў дзённік, Лёнька вырваў з рук і спрабаваў уцячы. Але Барыс Навумавіч схапіў яго за каршэнь і штурхануў з такой сілай, што той вылецеў за дзверы і апынуўся пад сцэнай, дзе ўборшчыцы трымалі свой інвентар. Ён схапіў венік, віхурай уляцеў у клас і... заехаў ім па твары настаўніка. Пасля чаго збег.

Вядома ж, яго выключылі са школы, і некалькі тыдняў ён не хадзіў на заняткі. Старэйшы яго брат Уладзімір, даўшы добрага прачуханца яму, дабраўся да раённых улад з пытаннем аб адпаведнасці настаўніка Фермана яго высокаму прызванню.

Катавасія працягвалася некалькі месяцаў. У выніку бакі памірыліся. Але наступныя два гады Барыс Навумавіч у нашым класе не выкладаў. А Лёнька паступіў у Гомельскі чыгуначны тэхнікум, пасля завочна закончыў Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту і стаў у Бабруйску адным з вядомых там прадпрымальнікаў. Некалькі гадоў таму ён, як мне казалі, памёр за рулём уласнай легкавушкі, калі вяртаўся з Мінска.

## ВЯСНЕ — ДАРОГУ!

Тры тыдні не было магчымасці наведацца да Сожа, як гэта рабіў кожны дзень. У бальніцы знаходзіўся і, як толькі выпісаўся, адразу ўзяў кірунак на рэчку. Звычка, нічога не скажаш, даўняя. З дзяцінства і юнацтва. Бо на вадзе вырас, на ёй і гадаваўся. У любую пару года, у любое надвор'е цягне да яе, да вады. Хай сабе і закаваная яна ў лядовы панцыр, але жыццё там ідзе, пульсуе. І гэта трэба адчуваць.

24 сакавіка. Субота. Выхадны дзень. Сонечны і крышачку марозны. Цёпла і адначасова халаднавата ў залежнасці ад таго, дзе знаходзішся: каля крутых схілаў Гомельскага парку, набярэжнай Сожа ці на пешаходным мосце праз яго. Але адтуль і адтуль у вочы кідаюцца вось такія дзівосы.

У спецыяльна вырубленай палонцы весела плёхаюцца два «маржы». Адзін з іх (відаць здалёк), калі выйшлі на бераг расціраўца ручнікамі, здаровы, у целе, яшчэ ў снезе пакачаўся, другі ж, нізкі, сухарэбры (падумалася: не «морж», а «ёрш») бадзёра рукамі размахвае, на месцы падскоквае. Не баяцца мужыкі холаду, у палонку некалькі маладых хлопцаў запрашаюць, што падышлі, а тыя — ні ў дугу.

Метраў за дваццаць ад «маржоў» двое рыбакоў зімнімі вудамі раз-пораз шморгаюць. А міма іх канькобым ходам тры дзяўчыны на лыжах снег рэжуць. А паралельна набярэжнай, дзе катар прарэзаў паласу лёду ад веслярнай базы да Кіеўскага спуску і ніжэй байдаркі і каноэ снуюць. Адзін з трэнераў спартсменаў, усцягнуўшы лодку на лёд, каманды ім падае з рупара. І гэта ніколечкі не палохае чародку дзікіх качак, што смела праляцела паўз пешаходны мост і апусцілася на ваду трохі ніжэй па цячэнні. Каб яны нікому не перашкаджалі. І каб ніхто не перашкаджаў ім.

Вырашыў зазірнуць на супрацьлеглы бераг. «Маржоў» ужо і след прастыў, а рыбакі па-ранейшаму на лёдзе. Не два, а чатыры ўжо. Папытанне. «Як са здабычай?» — пытаю. Тыя, двое, хваляцца: па пяць акунёў маюць. А гэта — цэлая патэльня. Трэці смяецца: «Кошка сердаваць будзе», і паказвае трафей — нягеглага ёршыка. А чацвёрты пры мне вышмаргнуў ладнага ментуза і тут жа адпусціў яго (забарона на лоўлю гэтай рыбы падчас нерасту) і заявіў, што яму не так важна здабыча рачных насельнікаў, як сам працэс лоўлі. З гэтым ніхто спрачацца і не думае.

Зарэчны парк. І тут лыжнікі шнуруюць, бо снегу яшчэ дастаткова. А дзе-нідзе на сонечных угрэвах з праталін-прасветлін выторкаецца счарнелая трава, за якой неўзабаве пойдзе і зялёненькая.

Дзе б ні праходзіў я ў той дзень па парку, на рэчцы, колькі ні сустракаліся мне па дарозе гамяльчане, заўважаў: настрой ва ўсіх прыўзняты. Інакш не магло быць: вясна прыйшла. Вясне — дарогу!

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ**

# РЫМСКІЯ «КАНІКУЛЫ»

## Чаму ўрадавы крызіс у Італіі ўзрушыў увесь Стары Свет?

**Навіны з Італіі апошнім часам трымаюцца ў топе стужак сусветных інфармагенцтваў. На Апенінах, паводле ацэнак экспертаў, на працягу некалькіх месяцаў развіваўся беспрэцэдэнтны палітычны крызіс.**
**Тут імкліва ўзмацнялася супрацьстаянне паміж еўраскептыкамі, якія перамаглі на выбарах у сакавіку, і палітыкамі, якія падтрымліваюць адзінства з ЕС. Спатрэбілася некалькі месяцаў, каб «Рух пяці зорак» і «Ліга» дамовіліся аб стварэнні кааліцыйнага ўрада, аднак прэзідэнт краіны Серджа Матарэла наклаў на яго вета і прапанаваў на разгляд парламента новую кандыдатуру прэм'ера. Праўда, учора з другой спробы ўрад усё ж быў зацверджаны.**
**Як праходзілі і чым завяршыліся 88-дзённыя «рымскія канікулы»?**



### ПРЭМ'ЕРСКІЯ «ШАХМАТЫ»

Кандыдатура на пасаду міністра эканомікі, вядомага ў Італіі еўраскептыка, 81-гадовага эканаміста Паола Савона стала «фатальнай перашкодай» для фарміравання новага ўрада, паколькі, на думку Серджа Матарэлы, пагражала прысутнасці Італіі ў еўразоне. Прапанова прэзідэнта замяніць Савону іншай кандыдатурай не сустрэла энтузіязму ў «Лізі» і «Пяці зорак». У сувязі з гэтым Джузэпэ Контэ, абраны партыямі ў якасці кандыдата ў прэм'еры, у мінулую нядзелю проста адмовіўся ад мандата на фарміраванне ўрада.



Джузэпэ Контэ стаў прэм'ер-міністрам Італіі.

А ў панядзелак, 28 мая, прэзідэнт Італіі даручыў сфарміраваць урад 64-гадоваму эканамісту Карла Катарэлі. Ён не належыць ні да адной з партый, якія ўдзельнічалі ў сакавіцкіх парламенцкіх выбарах. Прэзідэнт абраў яго ў якасці тэхнічнага прэм'ера, які павінен сфарміраваць урад і атрымаць адабрэнне парламента на яго работу. Пра гэта распавёў генсакратар прэзідэнцкай канцылярыі Уга Дзампеці ў эфіры тэлеканала Rai News.

Аднак Італія — краіна выбуховых эмоцый. Выбаршчыкі адчулі сябе ашуканымі, і замест канструктыўнага фарміравання ўрада (на падставе вынікаў сакавіцкіх парламенцкіх выбараў) актывізаваліся пратэстныя настроі. Выбар Матарэлы адкладае крызіс, але можа прывесці да яшчэ большага росту папулісцкіх настрояў на наступных выбарах», — заўважыла агенцтву Bloomberg Розамарыя Біцэці з рымскага Luiss University. — Людзі галасавалі за гэтыя партыі, і ім можа быць складана зразумець, чаму яны не могуць мець свой урад».

Лідары «Лігі» і «Пяці зорак» рашэнне прэзідэнта аб выбары тэхнічнага прэм'ер-міністра жорстка раскрытыкавалі, убачыўшы ў ім саступку Еўрасаюзу. «Калі няма адабрэння ў Берліне, Парыжы або Брусэлі, урад у Італіі не можа быць сфарміраваны. Гэта вар'яцтва, і я прашу італьянскі народ быць побач з намі, таму што мы хочам вярнуць дэмакратыю ў гэтую краіну. Мы сталі французскай ці нямецкай калоніяй. Мы сталі краінай, фінансава акупаванай брусельскімі дэмакратамі. Мы хочам ведаць дату выбараў ці на самай справе пойдзем на Рым», — заявіў лідар «Лігі» Матэа Сальвіні.

Лідар «Пяці зорак» Луіджы Дзі Маё ў сваю чаргу абвясціў аб пачатку кампаніі пад лозунгам «Мой голас мае значэнне» і заявіў пра неабходнасць імпічменту прэзідэнта. Абедзве партыі паабяцалі, што іх дэпутаты не будуць галасаваць за ўрад Катарэлі. У адмове падтрымаць тэхнічны кабінет з імі салідарнае аб'яднанне «Наперад, Італія» Сільвія Берлусконі. «Парламент выразна сказаў, што ўрад Катарэлі не будзе падтрыманы. «Наперад, Італія» не дасць галасоў», — напісаў у Facebook прадстаўнік фракцыі ў парламенце Джорджа Мулю.

«Еўрасаюз і фінансавыя рынкі чарговы раз канфіскуюць дэмакратыю. Тое, што адбываецца ў Італіі, — гэта дзяржпераварот, напад на італьянскі народ з боку нелегітымных інстытутаў. На фоне такога адмаўлення дэмакратыі па ўсёй Еўропе нарастае народны гнеў!» — пракаментавала сітуацыю на Апенінах лідар французскага «Нацыянальнага фронту» Марын Ле Пен на сваёй старонцы ў Twitter.



### МІСТАР НАЖНІЦЫ

«Гэтае рашэнне прэзідэнта беспрэцэдэнтнае і антыканстытуцыйнае. Ён не меў ніякага права адмовіцца ад падпісання прызначэння міністра эканомікі», — заявіў італьянскі палітолаг, былы дэпутат Еўрапарламента Джульета К'еза, паведамляе vz.ru. Аднак дэкан факультэта кіравання і палітыкі МДІМА, прафесар Акадэміі ваенных навук Генры Сардаран настроены не гэтак рэзка. «Матарэла пацвердзіў, што італьянскі прэзідэнт — не нейкая намінальная постаць. У выпадку палітычных крызісаў ён становіцца ключавым фактарам, і менавіта на ім ляжыць адказнасць за фарміраванне ўрада», — заўважыў эксперт.

У падтрымку ўрада з буйных сіл выступала толькі дэмпартыя на чале з Матэа Рэнца. Паводле яго слоў, Дзі Маё і Сальвіні трымалі Італію ў закладніках апошнія тры месяцы, бо не маглі сфарміраваць урад, што абышлося эканоміцы краіны стратай мільярдаў еўра.

Катарэлі нарадзіўся ў Крэмоне, скончыў Універсітэт Сіены, атрымаў ступень доктара эканамічных навук у Лонданскай школе эканомікі і палітычных навук. У пачатку кар'еры працаваў у Банку Італіі, пасля — у аддзеле фінансаў энергетычнай кампаніі Eni. У 1988 годзе пачаў працаваць у Міжнародным валютным фондзе, быў кіраўніком дэлегацыі МВФ у Італіі і Вялікабрытаніі. У 2013 годзе ва ўрадзе Энрыка Лета Катарэлі быў прызначаны надзвычайным камісарам па рэвізіі дзяржаўных выдаткаў. За гэтую працу атрымаў мянушку Містар Нажніцы.

«Мне здаецца больш верагодным, што мяне паклічуць у «Інтэр» гуляць на месцы Ікардзі як цэнтральнага нападаючага», — казаў ён некалькі месяцаў таму, калі журналісты пыталіся ў яго пра магчымае прызначэнне на пасаду прэм'ера, адзначала італьянскае інфармацыйнае агенцтва Ansa. Запрашэнне прыехаць да прэзідэнта паступіла, калі ён правяраў працы сваіх вучняў у міланскім Універсітэце Баконі, дзе выкладае як запрошаны прафесар. На візіт да прэзідэнта Катарэлі прыбыў на цягніку з заплечнікам.

### ВЯРТАННЕ АДВАКАТА

Эксперты адзначаюць, што палітычная сітуацыя ў Італіі — трэцяй па памеры эканоміцы еўразоны — магла перарасці ў сур'ёзны кантынентальны фінансавы крызіс. Адзін з індыкатараў пагрозы — павелічэнне розніцы паміж коштам дзяржаблігацый Германіі і Італіі, якая вызначае памер працэнтаў абслугоўвання знешняга доўгу. Гэты паказчык перавысіў максімальны ўзровень за апошнія пяць гадоў.



Палітычны крызіс у Італіі абрынуў еўрапейскія фондавыя рынкі.

У ЕС з трывогай сачылі за падзеямі на Апенінах: верагоднасць правядзення новых выбараў і канчатковага развароту краіны да папулізму вельмі высокая, паведаміў нямецкі тэлеканал N-TV. Як лічыць кіраўнік Еўракамісіі Жан-Клод Юнкер, «Італія мае найважнейшае значэнне для Еўрапейскага саюза». Гэтая краіна рызыкуе ператварыцца ў другую Грэцыю, аднак Рым атачае значна больш магутную эканоміку, якая мае вельмі важнае значэнне для Еўрасаюза, таму цяжкасці Італіі здольныя пахіснуць падмурак усяго Старога Свету, адзначае N-TV.

Днямі лідар «Руху пяці зорак» Луіджы Дзі Маё выйшаў з прапановай унесці змены ў спіс кандыдатаў, прызначыўшы на пасаду міністра эканомікі прэтэндэнта, які б задаволіў Матарэлу. У чацвер вечарам чарговыя перамовы лідараў «Пяці зорак» і «Лігі» прывялі да выпрацоўкі «ўмоў для фарміравання палітычнага ўрада», згодна з якімі Савона перайшоў бы на менш прыкметную ролю. Пасля гэтага выкліканы ў прэзідэнцкі Квірынальскі палац Катарэлі адмовіўся ад мандата, а Джузэпэ Контэ, які прыбыў туды праз некалькі гадзін пасля яго, пагадзіўся ўзначаліць урад і адразу прадставіў свой спіс міністраў.

Кіраўніком МЗС Італіі стане былы міністр па еўрапейскіх справах Энца Моавера-Міланэзі, які працаваў ва ўрадзе з 2011 па 2014 год. Пасаду кіраўніка МУС заняў федэральны сакратар «Лігі» Матэа Сальвіні, як чакаецца, на гэтай пасадзе ён зоймецца барацьбой з нелегальнай міграцыяй. Лідар «Руху пяці зорак» Луіджы Дзі Маё ўзначаліць аб'яднанае Міністэрства працы і эканамічнага развіцця (раней гэта былі два асобныя ведамствы). Разам з Сальвіні яны возьмуць на сябе таксама абавязкі віцэ-прэм'ераў. Міністэрства эканомікі і фінансаў Італіі ўзначаліць прафесар палітычнай эканомікі рымскага ўніверсітэта «Тор Вергата» Джавані Трыа. Эканаміст Савона, прызначэнне якога на пасаду кіраўніка Мінэканомікі раней заблакіраваў прэзідэнт, зойме пасаду міністра па справах Еўрасаюза. Кіраўніком Мінабароны стане прадстаўніца «Руху пяці зорак» Элізабета Трэнта.

Урад 54-гадовага адваката і ўніверсітэцкага прафесара ўчора ўвечары (напярэдадні нацыянальнага свята — Дня рэспублікі, — якое адзначаецца сёння) прынёс прысягу і з гэтага моманту лічыцца дзеючым. Затым ён атрымае вотум даверу ў абедзвюх палатах нацыянальнага парламента, дзе «Ліга» і «Рух пяці зорак» у сукупнасці валодаюць большасцю галасоў.

А міжнародны дэбют Контэ, які не меў раней палітычнага вопыту, адбудзецца ўжо праз тыдзень — у Канадзе на саміце «Групы сямі» (7-8 чэрвеня). У выніку замест абяцаных раней дэманстрацый у абарону парушанай дзяржаўнымі інстытутамі дэмакратыі будзе ям сумеснае ўшанаванне.

Як адзначае ТАСС, усе ўдзельнікі складанага палітычнага працэсу, якія можна параўнаць з цяжкімі родамі, выказалі задавальненне вынікам: і Сальвіні, які ўмацаваў і прымножыў сваю папулярнасць, і Дзі Маё, якому ўсё ж удалося выканаць ускладзеную на яго задачу прывесці «пяцізоркавых» да ўлады, і Матарэла, які, відавочна, уздыхнуў з палёгкай.

**Захар БУРАК.**

■ Выпрабавана на сабе

# ЯК Я СТАЎ... ЛЫСЫ

**Карэспандэнту «Звязды» ўпершыню ў жыцці пагалілі галаву. Сёння ж свята: 2 чэрвеня — Дзень лысых! Дарэчы, як высветлілася напярэдадні публікацыі, пра гэта мала хто ведае. Напрыклад, у Віцебску ніхто з ліку знаёмых журналістаў пра гэта нічога не чуў.**

## Самі і прыдумалі

Інфармацыю пра існаванне такога свята знайшоў у інтэрнэце. Між тым у сеціве згадваецца і іншая дата — 15 красавіка. Але большасць усіх сайтаў, якія пераглядзеў, сцвярджае: менавіта 2 чэрвеня — Дзень лысых. І дакладна невядома, хто першы прыдумаў святкаваць. Прачытаў, што ідэю прыдумалі ў пабе Лас-Вегаса, як і пра энтузіястаў з Масквы. Пра апошніх трохі ніжэй.

Пра лысых прыдумваюць анекдоты, яны часта ў цэнтры ўвагі кампаніі. Іх здымаюць у камедыях. Дарэчы, пра карысць лысіны. Бывае, змена іміджу дапамагае кар'еры. Аказваецца, зорны артыст Брус Уіліс ва ўзросце каля трыццаці пачаў лысець. І вельмі перажываў з-за гэтага. Але вырашыў галіць галаву і ў хуткім часе стаў усім нам вядомым «выратавальнікам чалавецтва», супергероем.

Скандальна вядомая ірландская спявачка і кампазітар Шынэйд О'Конар таксама лысая. Іншыя зорныя дамы перыядычна эксперыментуюць на гэты конт.

## Зусім не мой стыль!

Шмат расійскіх акцёраў лысыя: Дзмітрый Нагіеў, Фёдар Бандарчук, Гоша Куцэнка і г. д. Вядома, што і Філіп Кіркораў быў лысы, калі выконваў ролю святога Валянціна ў камедыі «Каханне ў вялікім горадзе — 2». Нямала лысых і сярод іншых вядомых творчых людзей.

Адчуваю магчымы скепсіс з боку знаёмых, калег. Накшталт: «Ну ты ж не Кіркораў!» Калі ўжо праз некалькі гадоў 50, дык «чорт у рабро»? Што не зробіш падчас «крызісу сярэдняга ўзросту»? Але гэта ўсё не пра мяне. Калі б ведаў пра гэтае свята раней, усё роўна напісаў бы аналагічны рэпартаж. Дарэчы, хацеў правесці эксперымент яшчэ летась, але жонка адгаварыла, адзначыўшы, што лысы і я — гэта як неба і зямля. Маўляў, тыпаж не той, бо зусім не брутальны. Ды, шчыра кажучы, былі комплексы. Тым больш што ў гады юнацтва лысіна для мяне асацыявалася або з пенсіянерамі, або з тымі, хто выйшаў пасля зняволення. Але сёлета вырашыў зрабіць тое, што задумаў.

Мой таварыш, фатограф Віктар Нікалаеў, вельмі дапамог. Акрамя таго, што паабяцаў фатаграфаваць працэс пераўтварэння валасатага ў лысага, дамовіўся з цырульніцай, каб яшчэ і пагаліла. Толькі трэба прыходзіць з індывідуальным інструментам кліента. Які менавіта інструмент патрэбны, мне не паведамілі. Таму я вырашыў, што касета станка для галення вядомай фірмы — тое, што трэба. Купіў у краме побач з карпунктам. Паколькі пастаянны кліент, прызнаюся, для чаго. Гандлярка парадавалася майму абяцанню паказацца потым.

## «Спыніце катаванні!»

Вырашыў прайсціся некалькі кіламетраў да цырульні пешшу. Па дарозе ўспамінаў кінатворы, дзе паказваюць, як воляй лёсу мужчыны становяцца лысымі. Напрыклад, Кіса Вараб'янінаў з «12 крэслаў». Памятаеце: закрычаў, каб Астап галіў, калі зразумеў, што з фарбаванымі валасамі ў савецкай Расіі нікуды з падвалу, дзе жыў дворнік, не выйдзе. Дарэчы, натхняў і эпізод, калі ён упершыню ўбачыў сябе ў люстэрка, і герою спадабалася быць лысым. Мо і мне таксама?

А яшчэ ўсмешку выклікаў фрагмент з фільма «Д'Артаньян і тры мушкецёры». Я пра няшчаснага, які служыў кардыналу, і яго пагаліў галоўны герой фільма. Памятаеце словы яго напарніка: «А што, табе пасуе!».

Майстар стрыжак у салоне «Рыа» на праспекце Чарняхоўскага пасадзіла ў зручнае крэсла. Калі Міла (так клічуць дзяўчыну) пачала машынкай стрыгчы валасы «пад нуль», нешта ў сэрцы «ёкнула». Я заплюшчваў вочы, міжвольна выкручваўся. Напэўна, вёў сябе так у дзяцінстве, калі трэба было вытрымаць «катаванні» ў цырульні. Праўда, прыборы тады былі прымітыўныя, таму і было перыядычна балюча галаве. У наш час адчуванні прыемныя.

Мае эмацыянальныя паводзіны толькі смяшылі цырульніцу-прыгажуню, калегу — таксама. Супакойвала, што ўсё больш мужчын просяць «пад нуль», асабліва летам.

Фатограф заінтрыгаваў тым, што ў мяне, аказваецца, унізе галавы вялікая радзімка. Віктар пажартаваў, што як у Гарбачова. А я і не ведаў!

Шчыра кажучы, у люстэрка я паглядзеў не адразу пасля стрыжкі. Убачыў там, на мой погляд, жах. А яшчэ ж трэба пагаліцца! Убачыўшы станок, які я дастаў з сумкі, Міла сказала, што неабходна было прынесці лязо менавіта для галення галавы. Прыйшлося выкарыстоўваць тое, што было. Міла не без цяжкасці, але старанна поўнасцю «ачысціла» галаву ад «калючак». Ні разу не парэзала. Прызнаюся, на гэты раз яшчэ больш не хацеў глядзецца ў люстэрка. Нават схаваўся за дзвярыма. Убачанае, мякка кажучы, зноў напужала.

## Цяпер... дарагі касцюм?

Думаў, калі выйду з цырульні, усе будуць на мяне глядзець. Ды мінакі не звярталі ўвагі.

Першую са знаёмых сустрэў калегу. Прайшла міма. Яна не пазнала, хоць вельмі хацеў запытаць яе наконт уражанняў.

Кіраўнік фірмы, пра якую не раз згадваў у публікацыях, ішоў насустрач, можна сказаць вочы ў вочы. Спыніўся і ацаніў мой новы вобраз. А калі пачуў пра свята лысых, парадаваўся.

Дырэктар Летняга амфітэатра прайшоў міма. Я падышоў да яго аўто, каб павітацца. Той сказаў, што мне вельмі пасуе. І нават дадаў, што для гэтага ўчынку, напэўна, была неабходна і мужнасць, каб рэзка змяніць імідж. Тым больш спецыяльна, каб менавіта паспець да невядомага яму свята.

А кіраўнік дырэкцыі міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», якога сустрэў праз некалькі хвілін, далікатна кіўнуў. Як заўсёды, дарэчы.

Больш за ўсіх радавалася гандлярка, якая прадала касету: «Прыкольна, прыкольна, прыкольна! Пасуе вам!»

Жанчына, з якой пазнаёміліся ў танцавальным гуртку, дзе займаецца нашы дзеці, не пазнала. Акуратна ўзяў яе за руку. Трохі спужалася, а пазнаўшы, пачала смяяцца. Сказала, што ўсё добра.

Міліцыянер у паважаным ведамстве ўпершыню праверыў сумку. А супрацоўніца (на жаль, ён паведаміў ёй па тэлефоне, хто да яе ідзе, таму сюрпрызу не атрымалася) сказала: «Ну, як? Ну, нармальна».

Дзеці, да якіх завітаў, адрэагавалі па-рознаму. 13-гадовы Міхаіл адразу і не зразумеў, няўжо гэта я. У яго нават вочы акругліліся. Хлопчык запытаў, навошта, сказаў, што мне лысіна не падыходзіць. 10-гадовы Аляксей усміхаўся і нічога не сказаў. Напэўна, будучы дыпламат? На жаль, кот, якога з павагай называю Цімафеем Міхайлавічам, спаў. Вырашылі не будзіць «важнага эксперта».

Мама маіх дзяцей не зразумела, хто перад ёй. Спачатку паглядзела вельмі сур'ёзна. Потым запытала: «Можа, у армію на зборы?». Пачуўшы пра свята, пачала разважаць, што лысіна патрабуе таго, каб змяніць імідж у цэлым. Напрыклад, трэба падкачаць мышцы. Вырашыў, што калі трэба змена, то кіну паліць, абавязкова! Пакуль «не Геракл», на яе погляд, ёсць іншыя варыянты. Напрыклад, вобраз творчага чалавека. У адзенні — вольны, лёгкі стыль. Нестандартныя штаны, напрыклад, неардынарная кашуля. А калі ўжо касцюм, дык дарагі, а лепш вельмі дарагі, каб падкрэсліваць статуснасць. Ды яшчэ пры ўсім гэтым трэба думаць, як галаву ад спякоты берагчы: капялюш ці кепка?

Калега з нацыянальнага тэлеканала не пазнала. Калі павітаўся, ледзь не выпусціла з рук сціплы журналісцкі перакус. Вельмі смяялася.

Знаёмая брунетка з банка аж шарахнулася. А калі пазнала, усміхнулася.

Свята запомніцца надоўга. Такое насамрэч не забываецца. Але вырашыў, што лысым добраахвотна больш не буду. Ды і цяжка самому рабіць неабходныя працэдуры, каб падтрымліваць галаву ў неабходнай для «прафесійнага лысага» форме.

Галоўны недахоп у выніку эксперымента — няма звычкі так выглядаць. Яшчэ нязручна насіць сонечныя акуляры на галаве. Пару разоў не ўпісаўся ў шкло ў офісах, бо без валасоў «дыстанцыю трымаць не навучыўся».

Плюсам лічу, што парадаваў людзей. Яшчэ памаладзеў, бо не бачна сівых валасоў, у спякоту не так праблемна. І, вау, можна некалькі месяцаў не траціцца на візіт у цырульню!

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота Віктара НІКАЛАЕВА**







■ Цікава пабачыць

# ТАЙНЫ КАМУНІКАЦЫЙ ПАЛАЦА

**Знаходкі археолагаў, якія датуюцца XIX — пачаткам XX стагоддзяў, выяўленыя ў выніку раскопак і рэстаўрацыйных работ на тэрыторыі Гомельскага палацава-паркавага ансамбля, сёння сталі экспанатамі выставы «Паркавая археалогія». Іх цяпер можна пабачыць у цэнтральнай частцы палаца Румянцавых і Паскевічаў.**

Рэчаў не занадта многа, але за кожнай — свая таямнічая гісторыя. **Навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі, ахове гісторыка-культурнай спадчыны Гомельскага палацава-паркавага ансамбля Юрый ПАНКОЎ** расказвае, што многія з сённяшніх артэфактаў да 2010 года знаходзіліся ў зямлі і былі літаральна адкрытыя толькі ў нашым стагоддзі:

— Артэфакты былі знойдзены ў выніку рэстаўрацыйных і археалагічных работ на капліцы і магільным склепе князёў Паскевічаў. Частку прадметаў выявілі падчас рэстаўрацыі Лебядзёвай сажалкі — былой рачулкі Гамяюк. Напрыклад, пры асушэнні дна былі знойдзены фрагменты некалі размаляванага жаночага бюста. Не выключана, што мармуровая фігура знаходзілася на балюстрадзе парку за палацам Паскевічаў. На жаль, яе галава зараз «існуе» асобна ад бюста: да нас дайшла фігура ў расколатым выглядзе.



Капліца сёння.

На старых фатаграфіях можна пабачыць, як выглядалі некалі будынкі ў знакамітым парку Паскевічаў. Дарэчы, як кажуць гісторыкі, нярэдка толькі апісанні і чарцяжы, фатаграфіі і малюнкі XIX — пачатку XX стагоддзяў і дапамагаюць вызначыць прызначэнне знойдзеных у парку фрагментаў збудаванняў і прадметаў:

— Тут цяпер можна пабачыць распісныя керамічныя маёлікі — гэта часткі ад капліцы. Па іх рэстаўратары аднаўлялі ўнікальную пабудову. **Загадчыца мастацкага аддзела Таццяна ЛІТВІНАВА** займаецца вывучэннем гісторыі капліцы і магільнага склепа. Яна правяла ўнікальныя даследаванні і высветліла, што кераміка прывозілася з Санкт-Пецярбурга, там яе выраблялі прафесійныя майстры.

Падчас раскопак была адкрыта вялікая колькасць тэхнічных тунэляў і камунікацый.

— А вось вентыляцыйная рашотка мае далучэнне да паветрадува, некалі ўсталявана ў склепе. Фрагмент мазаічнага пано таксама ёсць у экспазіцыі. Яно было некалі над уваходам у магільны склеп. Прадстаўлены невялікія цагліны-пальчаткі, якія выкарыстоўваліся пры будаўніцтве вентыляцыі. Вось пячная створка з выявай рымскай калясніцы. Яна, хутчэй за ўсё, была ўсталявана ў доме, дзе жыў святар. Дом стаяў паміж саборам Пятра і Паўла і склепам Паскевічаў і быў знесены ў 50—60-я гады мінулага стагоддзя. А дзверцу знайшлі ў 2010 годзе.



Мармуровы жаночы бюст быў знойдзены на дне Лебядзёвай сажалкі.

Многія археалагічныя экспанаты самым непасрэдным чынам звязаны з будаўніцтвам комплексу капліцы і магільнага склепа князёў Паскевічаў. Дзякуючы знаходкам, гісторыкам стала вядома і пра сур'ёзныя інжынерныя і тэхнічныя рашэнні, увасобленыя пры будаўніцтве гомельскага палаца і суседніх пабудоў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ**

## ОБЪЯВЛЕНИЕ

